Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ЛЮТАГА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 32 (29401)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА



ЧАМУ ПАДАРАЖЭЛІ «ЖЫРОЎКІ» 4



«ЧОРНЫ КОРПУС» ГЕНЕРАЛА ПЯТРОЎСКАГА 20

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры:**

*«У Год народнага адзінства мы павінны ўнесці свой важкі ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці, узмацніць значнасць беларускай культуры ў патрыятычным выхаванні. Своечасова заўважыць і падтрымаць талент, стварыць прывабныя ўмовы для яго раскрыцця — агульная задача дзяржавы, кіруючых і творчых кадраў. Збалансаванасць фінансавання ў сферы культуры паміж дзяржаўным бюджэтам, уласнымі сродкамі, спонсарскай і мецэнацкай дапамогай, цесная работа з рэгіёнамі, партнёрства з усімі суб'ектамі культурнай дзейнасці незалежна ад узроўню падпарадкаванасці — асноўныя кірункі і задачы нашай дзейнасці на 2021 год».*

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 лютага падпісаў Указ № 55 «Аб звальненні ў запас і прызыве на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве».**
- Тэст на COVID-19 метадам ПЛР у Нацыянальным аэрапорце Мінск могуць здаць толькі пасажыры рэйсаў.
- **Народны артыст РСФСР Андрэй Мягкоў памёр ва ўзросце 82 гадоў.**
- Найлепшым ляснічым па выніках працы за 2020 год стаў Уладзімір Жалнерчык з Высокаўскага лясніцтва Брэсцкага лясгаса.
- **У Гродзенскай вобласці ад каранавіруса пачалі прышчапляць педагогаў.**

ISSN 1990 — 763X

21032

9 771990 763008

# Кніга не ведае граніц і лакдаўнаў



### Адкрылася XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш

**У сталічным выставачным комплексе «БелЭкспа» ўчора было людна. Яшчэ да ўрачыстага адкрыцця Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу наведвальнікі разглядалі кнігі і задавалі пытанні гандлярам. Хтосьці рабіў фотаздымкі з прадстаўнікамі іншых краін, якія адзеліся ў нацыянальныя яркія касцюмы. Карацей, Мінскі кніжны форум па традыцыі сабраў нямала аматараў прыгожага пісьменства і паліграфічнага мастацтва. Кнігу пандэміяй напалохаць аказалася немагчыма.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.



Фота БелТА.

Урачыстае адкрыццё форуму пачалося з прывітальных слоў кіраўніка краіны, які зачытаў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ:** «За перыяд свайго існавання Мінскі кніжны форум стаў значнай дыскусійнай пляцоўкай не толькі для аўтараў і кнігавыдаўцоў, але і для шырокага кола інтэлектуалаў, якія любяць і шануюць якаснае друкаванае слова. Сімвалічна, што цэнтральным экспанентам сёлетняга форуму выступае Садружнасць Незалежных Дзяржаў. У трыццацігоддзе гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі Беларусь старшынствуе ў Садружнасці. Мінск заўсёды быў і застаецца прынцыповым прыхільнікам супольнасці і ўсебаковай інтэграцыі на постсавецкай прасторы. Знакавыя выданні дзяржаў — удзельніц СНД, прадстаўленыя на выстаўцы, заклікаваны садзейнічаць умацаванню гуманітарных сувязяў нашых краін і народаў».

Ад сябе Максім Рыжанкоў дадаў, што ў гісторыі існавання Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу не было ніводнага перапынку. Выключэннем не стаў і гэты напружаны з пункту гледжання пандэміі год: «Мы не маглі сабе дазволіць застацца без свята і чакалі яго з нецярпеннем, каб азнаёміцца з айчыннымі і замежнымі навінкамі».

СТАР. 3

За рулём

# ЗА ШТО БУДУЦЬ І НЕ БУДУЦЬ ШТРАФАВАЦЬ

### Якія перамены чакаюць беларускіх кіроўцаў з прыходам вясны?

**Новыя Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях будуць уведзены ў дзеянне з 1 сакавіка гэтага года. Змены ў значнай ступені датычацца кіроўцаў транспартных сродкаў: і тых, для каго знаходзіцца за рулём аўтамабіля — гэта работа, і тых, хто на работу (і не толькі) дабіраецца на асабістым аўто.**




Перш за ўсё, у новых дакументах адміністрацыйныя правапарушэнні аднесены да адной з трох катэгорый: грубыя, значныя і адміністрацыйныя правіннасці. «Правіннасць» — новае паняцце для нашай краіны. Шэраг парушэнняў Правіл дарожнага руху будуць лічыцца менавіта правіннасцямі і штраф за іх (калі правіна здзейснена ўпершыню) не прадугледжаны. Разгледзім іх з дапамогай спецыялістаў больш падрабязна.

СТАР. 6

З першых вуснаў

# «СІТУАЦЫЯ НЯПРОСТАЯ, АЛЕ ГЭТА СІТУАЦЫЯ МАГЧЫМАСЦЯЎ»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам

**Аўдыенцыя адбылася напярэдадні пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, якое запланавана на наступным тыдні ў Сочы, а таксама напрыканцы тэрміну знаходжання Рыгора Рапоты на пасадзе дзяржсакратара, які доўжыцца больш за 9 гадоў. Аляксандр Лукашэнка ўручыў яму ордэн Пашаны.**

Прэзідэнт адразу адзначыў, што аўдыенцыі з дзяржсакратаром не было даўно, хоць сустрэчы з ім падчас розных мерапрыемстваў адбываюцца рэгулярна. Апошняя — у рамках Усебеларускага народнага сходу.

***Мы маніторым сітуацыю пасля Усебеларускага народнага сходу,*** вы як спецыяліст разумееце, што ***мы павінны (і я асабліва) адчуваць, чым дыхае наша грамадства,*** — заўважыў з гэтай нагоды кіраўнік дзяржавы. — Гэта добра, што людзі, якія фарміруюць меркаванне, такія як вы, нармальна ўспрымаюць наш форум».

Сход застанецца ў гісторыі Беларусі, упэўнены Аляксандр Лукашэнка, бо на ім абмяркоўваліся вельмі важныя для краіны праблемы. Усе пытанні, якія былі агучаныя на УНС, а іх нямала, будуць апублікаваныя, дадаў беларускі лідар.

«Я лічу, што і сам у дакладзе, і ўвогуле выступоўцы былі досыць шчырыя, — адзначыў ён. — Таму на ўсе пытанні атрыманыя адказы. Думаю, і наша Расія нас пачула, і Захад».

У найбліжэйшы двухбаковы саміт (на пачатку 20-х дзён лютага), які, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, ужо анансаваны Крамлём і пра які было даўно дамоўлена з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, размова пра надзённыя праблемы супрацоўніцтва будзе працягнутая.

«Але адразу хачу сказаць — у нас, як бывае, падхопяць парадак дня: маўляў, Лукашэнка прыедзе там ажно тры мільярды долараў прасіць. Я не еду туды нечага прасіць, — пракаментаваў здагадкі, якія з'явіліся ў медыяпрасторы, кіраўнік дзяржавы. — Вось вы бачылі, мы падпісвалі на сёлета па энерганосьбітах (што для нас адчувальна), агульных рынках дакументы. Увогуле, ні пра што не прасілі і не спрачаліся. ***Калі Расія лічыць, што ўзровень нашага эканамічнага супрацоўніцтва павінен быць вось такой вышыні, значыць, ён такі і будзе.*** Чаго там хадзіць і прасіць? Трошкі лібералы Расіі адсталі ад адчувальных пытанняў, якія мы абмяркоўвалі».

На беларуска-расійскай сустрэчы вышэйшага ўзроўню, якая чакаецца, адбудзецца і абмеркаванне самых вострых пытанняў з намеснікам старшыні Савета Бяспекі Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Мядзведзевым, дадаў Прэзідэнт. Гэта датычыцца, у тым ліку, прынясця сумесных мер у святле пагрозы эканамічных санкцый з боку Захаду, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы можам усё пралічыць і цалкам сябе забяспечыць, за выключэннем нейкіх дэталяў, — не сумняваецца ён. — Цягам трох-пяці гадоў і дэталі тыя зробім у Беларусі і Расіі. У нас такі навуковы патэнцыял! І калі б мы гэта зрабілі, то і Украіна б да нас паціху падцягнулася. Я ўжо не кажу пра Казахстан і іншыя рэспублікі, якія не далёкія ад нас. Таму гэта — галоўнае пытанне: дамовіцца і забяспечыць нашу ўсю Айчыну ўсім неабходным».

Беларусы і расіяне ўсё ўмеюць рабіць, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, трэба толькі менш спадзявацца на рынак і лепш пралічваць будучыню. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у такіх вядучых эканомік свету, як Кітай і Японія, развіццё заснавана на планаванні і жалезнай дысцыпліне.

«І мы можам гэта зрабіць, — упэўнены ён. — ***І не трэба перажываць, што нам заўтра санкцыі ўвядуць. Добра, уводзьце. Але свае тавары будзеце спажываць у сябе. На наш рынак не прыйдзеце.*** А гэта ўсё-такі 150 мільёнаў чалавек. І гэта толькі нашы, бо праз Беларусь і Расію разыходзіцца вялізная колькасць тавараў».

Менавіта гэтаму будзе прысвечаны парадак дня найбліжэйшага пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка.

***«Трэба выкарыстоўваць сітуацыю. Сітуацыя няпростая, але гэта сітуацыя магчымасцяў. Хутка развернемся, будзем працаваць лепш,*** — рэзюмаваў ён. — Вось мы не закрыліся ў свой час, вы ведаеце, эканоміку не закрылі і за студзень толькі ў прамысловасці дадалі 9 працэнтаў да мінулага года, у які зніжэння не адбылося. Чаму? Не таму, што мы вялікія, а таму, што многія эканомікі свету перасталі працаваць».

Ёсць магчымасці зараз і для супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, падкрэсліў Прэзідэнт.

Рыгор Рапота падзякаваў Аляксандру Лукашэнку і ўсім дзяржаўным дзеячам Беларусі за гады работы на пасадзе дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы і дадаў, што ўзаемадзеянне дзвюх краін вельмі важна як для абодвух народаў, так і для ўсёй постсавецкай прасторы.

«Дзе б я далей ні апынуўся, натуральна, я гэтай тэме буду адданы, тым больш што ў мяне тут ёсць пэўныя незавершаныя праекты, пэўныя фантазіі, якія часам могуць прыводзіць і да пэўных вынікаў», — паабяцаў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### У тэму

«Мы ў асноўным гаварылі пра стан Саюзнай дзяржавы, пра нейкія рэчы, якія зараз хвалююць і беларускі, і расійскі бок, — пракаментаваў пазней журналістам вынікі аўдыенцыі Рыгор Рапота. — І ў сувязі са зменай каравула хацелася б (і гэта ўзаемнае наша пажаданне) захаваць дынамку там, дзе яна ёсць, і вырашыць праблемы, якіх у нас шмат. Размова ішла пра эканамічны складнік і пра пытанні ўзаемнага даверу — тое, што выбудоўваецца гадамі, але вельмі лёгка разбурыць».

Беларусь і Расія зрабілі вельмі шмат для таго, каб грамадзяне абедзвюх краін адчувалі сябе на тэрыторыі ўсёй саюзнай прасторы як дома. Удалося дабіцца добрых вынікаў у сферах перамяшчэння, медыцынскай дапамогі, пенсійнага забеспячэння і іншых, дзе страты дасягнутага людзі адчуюць непасрэдна, лічыць Рыгор Рапота. Гэта датычыцца і буйных эканамічных праектаў.

На шчасце, дасягненні Саюзнай дзяржавы летась удалося захаваць, і зараз адчуваецца жаданне з абодвух бакоў іх развіваць, рэзюмаваў Рыгор Рапота.

Датычна пачуццяў, з якімі дзяржсакратар аглядаецца на 9 гадоў сваёй работы, суразмоўнік прызнаўся, што эмоцыі яго перапаўняюць, пры гэтым ён ніколі не сумняваўся ў патрэбнасці інтэграцыі.

«Мне хацелася б як мага больш нейкіх сумесных буйных праектаў, — дадаў ён. — Гэта могуць быць транспартныя праекты, навуковыя».

Ён расказаў, што Пасткам і ён асабіста горача падтрымліваюць ідэю аб'яднаць намаганні Беларусі і Расіі ў пытаннях тэхналагічнага асваення Арктыкі. Ідзе размова пра стварэнне адпаведнага цэнтра ў Архангельску.

Яшчэ адна добрая перспектыва для сумеснай работы — сучасныя транспартныя магістралі (чыгунка і аўтамабільныя дарогі, па якіх можна бяспечна перамяшчацца на вялікай хуткасці), якія злучаюць дзве краіны, выходзяць за іх межы і робяць Расію і Беларусь мостам паміж Азіяй і Еўропай.

На пытанне журналіста «Звязды», калі можна чакаць поўнага адкрыцця межаў Расіі для беларусаў, ён адказаў: «Мне цяжка казаць, бо не ад мяне гэта залежыць, я ўжо ўсё адкрыў бы (пры захаванні неабходных санітарных нормаў). Думаю, у найбліжэйшы час гэта ўсё неяк наладзіцца. Мяркую, да лета павінны быць ужо больш свабодныя перамяшчэнні, у тым ліку аўтамабільныя, больш стане і цягнікоў».

Слова — удзельнікам




# «ПАТРАБУЕЦЦА ХАЛОДНЫ, РАЗВАЖЛІВЫ РОЗУМ І ДАКЛАДНЫ РАЗЛІК НА НАЙБЛІЖЭЙШУЮ ПЕРСПЕКТЫВУ»



**Яшчэ на стадыі падрыхтоўкі і падчас VI Усебеларускага народнага сходу з 17 тысяч прапаноў па перспектывах развіцця краіны, якія паступілі ад насельніцтва, большая частка закранала эканамічную тэматыку. Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Галіна ЛАГУНОВА запэўніла, што ў адрэдагаваным варыянце прапановы грамадзян і спецыялістаў увайшлі ў асноўныя палажэнні праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады, якая заклікана забяспечыць мадэрнізацыю эканомікі і рост дабрабыту грамадзян.**

«У шчырых дакладах і выступленнях на форуме мы рэальна ўбачылі і ўсвядомілі, што наша эканамічная мадэль уяўляе сабой тонкую і адчувальную да любых змен структуру, — лічыць дэпутат. — На яе нельга ўздзейнічаць у парыве эмоцый, а патрабуецца халодны, разважлівы розум і дакладны разлік на найбліжэйшую перспектыву. Гэта важна, бо менавіта эканоміка дае жыццё краіне».

У выніковай рэзалюцыі сходу аб'ектыўна падкрэслены недахопы і поспехі нашай эканомікі. Нягледзячы на тое, што Беларусь займае 49-ю пазіцыю сярод 190 эканомік свету ў рэйтынгу Сусветнага банка Doing Business («Вядзенне бізнесу — 2020»), застаецца нявырашаным шэраг пытанняў, якія патрабуюць больш інтэнсіўнага росту ВУП, экспарту і інвестыцый.

Падчас УНС вызначаны шляхі, за кошт якіх будзе ажыццяўляцца эвалюцыйнае развіццё эканомікі. Перш за ўсё будзе выбудоўвацца адукацыйная сістэма ў выхаванні і навучанні спецыялістаў пад патрэбнасці эканомікі. Гэтага вымагае сённяшняя структура, якая выйшла на ўзровень стварэння новых прыкладных вытворчых магутнасцяў у такіх галінах, як космас, ядзерная энергетыка, біяхімія, IT, лічбавізацыя і іншыя.

Не менш актуальнымі з'яўляюцца далейшая рэканструкцыя і мадэрнізацыя існуючых вытворчасцяў, якія стануць апорай для новых вытворчасцяў канкурэнтаздольных відаў прадукцыі.

У плане забеспячэння харчовай бяспекі прадугледжана павышэнне канкурэнтаздольнасці аграпрамысловага комплексу праз укараненне адаптыўных рэгіянальных, эфектыўных тэхналогій, узмацнення біябяспекі і дысцыпліны землекарыстання, паглыбленне кааперацыі ў вытворчасці сельгаспрадукцыі і якасных прадуктаў харчавання.

Сканцэнтраванасць па рэгіянальным развіцці дазволіць рэалізаваць у кожнай з абласцей не менш за 2-3 буйныя аб'екты (у тым ліку машынапаркі) па імпартазамяшчэнні і эфектыўным выкарыстанні мясцовых сыравінных рэсурсаў (па 2-3 аб'екты). Гэта павінна прывесці да стварэння новых кластараў у партнёрстве «дзяржава—бізнес».

Вызваленыя ці менш запатрабаваныя сегменты эканомікі (напрыклад, у авіяцыйных, чыгуначных зносінах і інш.) патрабуюць мультымадальнай пераарыентацыі пад кабатажныя (мясцовыя) умовы, гэта дазволіць забяспечыць новымі рабочымі месцамі і дастойнай зарплатай людзей.

«Таксама на будучае пяцігоддзе намечана зрабіць рамонт 24 мастоў і каля 7 тысяч км дарог рэгіянальнага значэння, — дадала Галіна Лагунова. — Пабудаваць 4 млн $м^2$ жылля, замяніць 5 тысяч устарэлых ліфтоў, уладкаваць 20 тысяч дваровых тэрыторый, узвесці станцыі абезжалезвання і забяспечыць беларусаў чыстай пітной вадой і арганізаваць другасную перапрацоўку адходаў вытворчасці».

У знешнеэканамічнай палітыцы прадугледжана развіваць узаемавыгадную эканамічную інтэграцыю ў рамках Саюзнай дзяржавы, ЕАЭС і СНД, умацаваць стратэгічнае супрацоўніцтва з КНР і пашырыць экспарт на новыя рынкі збыту прадукцыі.

Галіна Лагунова ўпэўнена, што ўсе мерапрыемствы Праграмы канкрэтныя і ўтрымліваюць тэрміны выканання і пералік адказных, што дазволіць забяспечыць кантроль над выкананнем і суразмернасць фінансавання.

«Да канца 2025 года закамерным і чаканым вынікам Праграмы эканамічнага развіцця краіны стане не толькі істотнае павышэнне дабрабыту беларусаў, але і прывабнасць Беларусі і яе брэндавых тавараў на міжнародным узроўні», — сказала парламентарый.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Блізкая ўлада

## Мясцовыя праблемы — мясцовае рашэнне

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 20 лютага, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

# Кніга не ведае граніц і лакдаўнаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аб дзейнасці выдавецтва Саюзнай дзяржавы выказаўся **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Рыгор РАПОТА:** «Для нас заўсёды вялікі гонар удзельнічаць у такім выдатным форуме, які адбываецца сёння. Кожны год мы робім справаздачу аб сваёй рабоце — выдавецкай дзейнасці ў межах Саюзнай дзяржавы. Натуральна, мы не можам канкурыраваць з вялікімі выдавецтвамі. Мы толькі засяроджваем сваю ўвагу на тым, каб асвятляць культуру, навуку, тэхніку — тыя сферы сучаснага жыцця, якія звязваюць нашы краіны».



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Міністр інфармацыі Беларусі Ігар ЛУЦКІ** адзначыў: «Беларусь была і ёсць тэрыторыяй міру і згоды. Арганізатары выстаўкі сёлета, выбіраючы цэнтральнага экспанента, вырашылі аддаць гэтае права Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На працягу доўгага часу ў Садружнасці праходзіць конкурс «Мастацтва кнігі» — гэта вельмі важнае гуманітарнае мерапрыемства, якое аб'ядноўвае людзей і краіны.

Таксама ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці кніжнага форуму прыняў **спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ.** Ён адзначыў, што кніга не ведае граніц і лакдаўнаў, а літаратура і мова існуюць паўзверх самых складаных палітычных калізій. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ пажадаў пісьменнікам праявіць усю моц розуму і таленту, каб зрабіць свет лепшым. Намеснік старшыні Выканаўчага камітэта СНД Бекетжан ЖУМАХАНАЎ зачытаў урачыстыя словы падзякі старшыні Выканаўчага камітэта Сяргея Лебедзева. Уладзімір ГРЫГОР'ЕЎ, намеснік кіраўніка Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях Расійскай Федэрацыі, павіншаваў усіх удзельнікаў з магчымасцю аднавіць сваю дзейнасць, наладзіць дыялог і абмеркаваць тэмы, якія ўсіх цікавяць.




**Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА,** які таксама наведаў выстаўку-кірмаш, азнаёміўся з экспазіцыяй і засяродзіў увагу на дзіцячых выданнях. «Калі б мы глядзелі толькі катэгорыямі эканомікі, то, напэўна, страціў бы цэлы пласт важнай літаратуры патрыятычнага і эстэтычнага выхавання, падручнікаў, — сказаў ён. — У такім выпадку ўсе сышлі б у пагоні за прыбыткам, умоўна кажучы, у камерцыйную літаратуру, якая выдаецца вялізнымі тыражамі. Наколькі я ведаю, практычна ва ўсіх краінах кнігавыдавецкая дзейнасць у той ці іншай ступені грунтуецца ў рэчышчы так званых дзяржаўна важных твораў. Сапраўды гэтак жа адбываецца ў той жа Еўропе. Я лічу, што гэта нармальна. Тым больш гаворка не ідзе аб нейкіх казачных сумах. Многія кнігі проста не могуць выдавацца такімі накладамі, якія забяспечылі б поўную акупнасць. Але мы бачым выдатныя кнігі, якія выдаюцца і на беларускай мове тыражамі ў 1-1,5 тыс. экзэмпляраў. Такім чынам, мы забяспечваем разнастайнасць літаратуры для дзяцей.

Урачыстая частка кніжнага форуму скончылася, а вось асноўных удзельнікаў выстаўкі — кнігавыдаўцоў — чакае напружаная праца на працягу чатырох дзён.

Выдавецкі дом «Звязда» сёлета шырока прэзентуе аўтара Кацярыну Хадасевіч-Лісавую. Яе апошняя дзіцячая кніга «Загадка прынцэсы Агнесы» закранае тэму шахмат. Здавалася б, занадта сур'ёзная тэма — але насамрэч дзеці цікавяцца мудрай гульнёй. Дый як не зацікавіцца, калі аўтарка з'явілася на прэзентацыю ў выглядзе казачнай Шахматнай Феі, ці Каралевы, і пры дапамозе яе і яе герояў засвоіць складаныя правілы аказалася так весела. Што датычыцца дарослай аўдыторыі, то Выдавецкі дом «Звязда» таксама мае чым яе зацікавіць, у першы ж дзень адбылася прэзентацыя кніг Інесы Плескачэўскай «Як разгадаць Кітай» і «Без жалезнай заслоны». У наступныя дні на нашым стэндзе таксама будзе цікава (падрабязна пра гэта мы пісалі ва ўчарашнім нумары).

> **«Кніга не ведае граніц і лакдаўнаў, а літаратура і мова існуюць паўзверх самых складаных палітычных калізій».**

Адзначым, што ў кніжным форуме ўдзельнічаюць дваццаць краін. У тым ліку свае экспазіцыі прадстаўляюць Расія, Казахстан, Іран, Венесуэла, Палесціна, Аўстрыя, Пакістан, Турцыя, Германія.

На працягу ўсіх чатырох дзён выстаўка будзе пачынаць сваю работу а 10-й гадзіне раніцы, а заканчваць — у 20.00. Звярніце ўвагу, што ў нядзелю форум скончыцца на дзве гадзіны раней — у 18.00.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Шануй сваё

## Хутка будзе новы беларускі буквар

### Што робіцца для пашырэння беларускай мовы ў сферы адукацыі

**Калі ў пачатку 90-х гадоў карыстальнікаў інтэрнэту было каля 4 мільёнаў, у 2000-м — 8 мільёнаў, то на студзень гэтага года ў павуціне патрапіла ўжо палова свету — больш за 4,5 мільярда. Натуральна, такая актыўнасць тоіць у сабе шмат пагроз. Паводле даных ЮНЕСКА, прыкладна тром працэнтам моў пагражае знікненне. Беларуская мова мае, як і яшчэ 592 іншыя мовы, статус «хісткае становішча», гэта значыць, што сфера яе выкарыстання звужана.**

Але пра «моўную» небяспеку глабалізацыі задумваюцца нават і тыя краіны, якім, здавалася б, нічога не пагражае. Так, у Францыі яшчэ ў 90-я гады прынялі закон, які рэгламентуе сферы ўжывання французскай мовы. У выніку яна стала мовай асветы. Толькі на ёй можна прымаць іспыты, выдаваць дыпломы, абараняць дысертацыі і г. д. Пэўныя захады робяцца і ў Германіі, і ў многіх іншых краінах.

У Беларусі таксама прымаюцца захады для таго, каб забяспечыць роўнасць выкарыстання беларускай і рускай моў у адукацыйным працэсе на ўзроўні дашкольнай, агульнасярэдняй і спецыяльнай адукацыі, расказаў начальнік упраўлення маніторынгу якасці адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь» Вячаслаў Караткевіч. У прыватнасці, сёння мы маем падручнікі па ўсіх прадметах як на рускай, так і на беларускай мове. Пастаянна вядзецца работа па перакладзе шматлікіх нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць адукацыйны працэс. Кожны карыстальнік можа мець дакумент на той мове, на якой пажадае. Шмат робіцца і для таго, каб было метадычнае забеспячэнне выкладання розных прадметаў на беларускай мове.

З гэтага года пачаў дзейнічаць адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс, які прызначаны для дапамогі ў вывучэнні вучэбных прадметаў самастойна. Сёння большая доля кантэнту — на рускай мове, але перад Нацыянальным інстытутам адукацыі пастаўлена задача аб беларускамоўным напаўненні гэтага рэсурсу.

Хутка будзе завершана работа над новым букваром для дзяцей, якія будуць навучацца па-беларуску.

Шукаюцца новыя падыходы, як папулярызаваць беларускія культурныя каштоўнасці ў навучальным працэсе. Інфармацыю можна падаваць па-рознаму. Напрыклад, уся лінейка падручнікаў па беларускай мове ў сваім афармленні на вокладках мае выявы помнікаў дзеячам беларускага друкавання і асветы. Падчас вывучэння беларускай мовы дзеці выконваюць заданні, праз якія падаецца інфармацыя, звязаная з гэтымі помнікамі і асветнікамі.

Нацыянальным інстытутам адукацыі праводзіцца шмат конкурсаў для вучняў з мэтай папулярызацыі беларускай мовы і нават для пашырэння яе за межамі Беларусі. Так летась быў праведзены конкурс «Беларусь і Кітай. Мост у будучыню», у якім прынялі ўдзел і жыхары Паднябеснай. Конкурс скіраваны на спазнаванне адзін аднаго, у тым ліку і праз мову. Выйшаў падручнік беларускай мовы для замежных грамадзян. У інстытуце пачалася распрацоўка навуковай тэмы, звязанай з вывучэннем беларускай мовы як замежнай.

Супрацоўнікі Нацыянальнага інстытута адукацыі ўпэўнены, што абуджэннем цікавасці да беларускай мовы за межамі краіны, яны ў тым ліку ўплываюць на больш паважлівае стаўленне да яе айчыннай моладзі. Важна паказаць, што мы цікавыя свету і што беларуская мова мае права на развіццё.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Большасць жыхароў ЗША выказалася за стварэнне трэцяй буйной партыі



Злучаным Штатам патрэбна трэцяя буйная палітычная партыя, лічыць 62 працэнты амерыканцаў, якія ўзялі ўдзел у апытанні грамадскай думкі, праведзеным Інстытутам Гэлапа ў 50 штатах. Рэспандэнты адзначаюць, што дзве цяперашнія асноўныя партыі — Дэмакратычная і Рэспубліканская — «дрэнна працуюць», паведаміла The Hill, спасылаючыся на вынікі апытання. Даследаванне паказала, што станоўчыя рэйтынгі абедзвюх партый ніжэйшыя за 50 %: дэмакраты набралі 48 %, рэспубліканцы — 37 %. Чацвёра з дзесяці рэспубліканцаў лічаць, што пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў колішняга прэзідэнта Дональда Трампа іх партыя павінна стаць больш кансерватыўнай. 34 % спадзяецца, што яна застанецца ранейшай, а 24 % жадае бачыць яе ўмеранай.

### Амстэрдам зрушыў Лондан з пазіцыі вядучага еўрапейскага цэнтра гандлю акцыямі




Сталіца Нідэрландаў стала вядучым у Старым Свеце цэнтрам гандлю акцыямі пасля завяршэння пераходнага перыяду «брэксіту». Як адзначыла газета Financial Times, сярэдні абарот таргоў акцыямі Euronext Amsterdam і нідэрландскіх падраздзяленняў CBOE Europe і Turquoise ў студзені склаў 9,2 мільярда еўра ў дзень. А гэта больш чым у 4 разы вышэй за ўзровень снежня. Пры гэтым у сталіцы Вялікабрытаніі сярэднядзённы абарот таргоў акцыямі скараціўся да 8,6 млрд еўра. Забарона на гандаль у Лондане для фінансавых інстытутаў Еўропы пасля змены статусу Вялікабрытаніі ў ЕС прывяла да пераводу з брытанскай сталіцы адразу пасля заканчэння тэрміну пераходнага перыяду «брэксіту» здзелак на суму каля 6,5 млрд еўра ў дзень.

### Эверэст афіцыйна «падрос» амаль на метр



Самы высокі пункт на Зямлі стаў яшчэ вышэйшы. Цяпер Эверэст узвышаецца над узроўнем мора на 8848,86 метра. Такім чынам, паводле вынікаў даследавання, гара «падрасла» на цэлых 86 сантыметраў у параўнанні з вышынёй, якую да гэтага моманту прызнавалі ўрады краін, на тэрыторыі якіх яна знаходзіцца (Непала і Кітая). Эксперты сыходзяцца на думцы, што павелічэнне вышыні Эверэста, або Сагарматхі — так гару называюць мясцовыя жыхары, — усё ж не звязана з прыроднымі катаклізмамі. Проста ў навукоўцаў з'явіліся новыя, больш дакладныя метады вымярэнняў, лічаць яны. Аб павелічэнні «росту» легендарнай гары было ўпершыню абвешчана ў сумеснай заяве Дэпартамента геадэзіі Непала і кітайскіх улад. Яна стала кульмінацыяй шматгадовага праекта па максімальна дакладным вымярэнні гімалайскай вяршыні.

Камунальныя стасункі

# ЗНІЗІЎСЯ ГРАДУС — ПАВЫСІЎСЯ КОШТ

## Чаму «жыроўкі» за студзень аказаліся нечакана «важкія»

**Марозная зіма прынесла беларусам не толькі гарэзлівыя снежныя забавы, але і сур'ёзныя лічбы ў першых за сёлета «жыроўках», якія праз студзеньскае пахаладанне аказаліся «цяжэйшыя», чым чакалася. Нагадаем, што падрасці «камуналка» павінна была з новага года на 4,2 долара (у эквіваленце), аднак упісацца ў гэтую лічбу ў камунальнікаў не атрымалася, бо на ацяпленне жылфонду праз моцныя маразы спатрэбілася больш гігакалорый, расказалі ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**



Да штогадовага павышэння аплаты жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) у сярэднім на пяць долараў (для «двухпакаёўкі» з трыма жыхарамі), якое звычайна падзяляецца на два этапы: у студзені (на 4,2 долара) і ў чэрвені (на 0,8 долара), сёлета дадалося марознае надвор'е. Праз дадатковае ацяпленне «жыроўка» ў «двухпакаёўцы» дадаткова пацяжэла яшчэ прыкладна на сем рублёў. Дадайце да гэтай сумы запланаванае з 1 студзеня павелічэнне тарыфаў на электрычнасць (на 10 %), газ (на 14,8 %), водазабеспячэнне (на 11,3 %) і водаадвядзенне (на 11 %), капрамонт (на 38,5 %), тэхабслугоўванне ліфта (на 4,2 %) і можаце самі падлічыць, якая частка ў павялічанай суме плацяжу набегла за дадатковыя гігакалорыі.

У розных кватэрах сумы налічэнняў за студзень павялічыліся ў залежнасці ад плошчы жылля, месцазнаходжання дома, яго энергаэфектыўнасці і рэгіёна пражывання. Памер платы за ацяпленне жылых памяшканняў можа вар'іравацца і ў залежнасці ад умоў надвор'я. А большасць шматкватэрных дамоў у краіне абсталявана прыборамі групавога ўліку расходу цеплаэнергіі. Як вынік, сума аплаты можа мяняцца пры нязменных тарыфах і залежаць ад колькасці зрасходаванага цяпла на абагрэў жылля, растлумачылі ў міністэрстве.

— *У сувязі з пахаладаннем у студзені 2021 года расход цеплаэнергіі павялічыўся ў параўнанні са снежнем — адпаведна, падрасла і сума налічэнняў за ацяпленне. Другім радком у росце аплаты ЖКП стала планавае павелічэнне тарыфаў са студзеня. Разам яны і павялічылі суму па-за межамі мяркуемых лічбаў. Аднак гэта не азначае, што ўжо са студзеня павялічылася планавае налічэнне за ацяпленне. Яно, як і меркавалася, адбудзецца ў чэрвені,* — расказаў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства ЖКГ.** — *Да таго ж трэба глядзець, з чаго склалася павялічаная сума па кожнай асобнай кватэры. Напрыклад, вы спажылі ў снежні тры «кубы» вады, а ў студзені — пяць, гэта таксама павялічыць лічбу за студзень.*

«Марозная» сярэдняя лічба, якая паспрыяла павелічэнню аплаты студзеньскай «камуналкі», па інфармацыі Белгідрамета, за снежань склала -0,5 °C па краіне і -1,2 °C — па Мінску, а за студзень — -3,7 °C па Беларусі і -4,5 °C — па сталіцы.

— *Варта ўлічваць таксама, што мінулагодняе летняе павышэнне тарыфаў (з 1 чэрвеня) на ацяпленне мы адчулі толькі з пачаткам ацяпляльнага сезона 2020—2021 гадоў. А сёлета з 1 чэрвеня тарыф на цеплазабеспячэнне і ацяпленне чарговы раз павялічыцца на 0,8 долара ў эквіваленце. І гэты рост мы адчуем на падагрэве вады толькі ў ліпені 2021-га, а тарыфныя сумы за ацяпленне падрастуць толькі ў ацяпляльным сезоне 2021—2022 гадоў,* — удакладніў Генадзь Аксціловіч.

У нейкім сэнсе «пашанцавала» тым дамам, дзе няма прыбораў уліку цяпла і плата за ацяпленне — пастаянная велічыня ўвесь ацяпляльны перыяд з кастрычніка да красавіка незалежна ад градуса за акном і колькасці затрачаных на абагрэў жылля гігакалорый. Пераразлік за ацяпленне ў такіх дамах робіцца па выніках ацяпляльнага перыяду.

У Міністэрстве ЖКГ нагадалі, што беларусы могуць звярнуцца ў разлікова-даведачныя цэнтры па месцы жыхарства, калі ў іх узнікаюць пытанні па налічэнні аплаты за ЖКП або ў выпадку няспраўнасці прыбораў уліку расходу цеплаэнергіі. Калі гэта паўплывала на суму налічэнняў, будзе зроблены пераразлік.

Калі сачыць за слупком тэрмометра, то можна заўважыць, што ў лютым марозных дзён яшчэ больш, чым у студзені, хоць месяц і карацейшы. Прагназаваць, ці павялічацца (або наколькі) сумы «жыровак», якія мы атрымаем у сакавіку за люты, — цяжка, але варта быць гатовымі да ўсяго, проста на ўсялякі выпадак. Напрыканцы прывяду дзве лічбы з «жыроўкі» за «асноўныя жыллёва-камунальныя паслугі» ў «двухпакаёўцы» з чатырма пражываючымі. За студзень 2020-га — 58 рублёў, за студзень 2021-га — 62 рублі.

**Ірына СІДАРОК.**

Надвор'е

# ВОСЬ І МОКРЫ СНЕГ, А МЕСЦАМІ І ДОЖДЖ

## Пачынаючы з выхадных сіноптыкі абяцаюць нам лютаўскую адлігу

**А пакуль нам трэба будзе яшчэ крыху памерзнуць. Прынамсі сёння, бо ўмовы надвор'я ў Беларусі ў асноўным будзе вызначаць паўночны халодны антыцыклон, сфарміраваны ў арктычным паветры. Аднак, пачынаючы з суботы, маразы ў нашай краіне пачнуць слабець, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А сёння ўдзень атмасферны ціск пачне падаць, і да захаду Беларусі падыдзе франтальны раздзел. Таму чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег, месцамі прагназуецца слабы галалёд. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца.

Эксперты-сіноптыкі расказваюць, што ў суботу сітуацыя ў атмасферы пачне мяняцца. Атмасферны фронт з захаду, ссоўваючыся на ўсход, будзе адціскаць з тэрыторыі краіны халоднае паветра ў бок Расіі. Маразы аслабеюць. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 7—14 градусаў, па ўсходзе 15—19 марозу, у крайніх паўднёва-заходніх раёнах месцамі мінус 1—6 градусаў. Пад уздзеяннем сонца маразы наогул месцамі адступяць. Удзень будзе мінус 1—8 градусаў, па паўднёва-заходняй палове краіны месцамі ад нуля да 4 цяпла. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Уначы на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвы, удзень з пераходам на заходні ўмераны.

У нядзелю нас чакае «вестка» з-за мора. Гэта адаб'ецца ўплыў малаактыўных франтальных раздзелаў, якія перамяшчаюцца з Балтыйскага мора. Месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах прагназуюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер умераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла, па ўсходзе 7—10 марозу. Удзень будзе ад мінус 2 да 4 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня пад уплывам вільготнай паветранай масы атлантычнага паходжання адліжнае надвор'е распаўсюдзіцца на большую частку тэрыторыі краіны. Ужо ў панядзелак тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла. Удзень будзе наогул цёпла для лютага — ад мінус 2 градусаў па ўсходзе да плюс 6 па захадзе Беларусі. Па паўночным усходзе, дзе надвор'е будзе вызначаць франтальны раздзел, прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі па краіне могуць згушчацца туманы, магчымы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца.

Таксама хлюпотна прагназуецца і ў аўторак, калі наша тэрыторыя будзе знаходзіцца пад уплывам маларухомага слабавыяўленага атмасфернага фронту. Ападкаў чакаецца няшмат. У асобных раёнах будуць згушчацца туманы, магчымы галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Уначы ў аўторак тэмпература паветра складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях ад мінус 8 да мінус 15 градусаў. У дзённыя гадзіны сонца будзе разаграваць паветра ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Спорт

# Беларускі баскетбол робіць «Крок у будучыню»

## Новы этап міжнароднага праекта стартаваў у Гомелі

**Беларуская федэрацыя баскетбола разам з ФІБА Еўропа пачала новы этап сумеснага праекта «Крок у будучыню». Праект закране ўсе рэгіёны краіны. Першым стаў Гомель, куды з'ехаліся 23 трэнеры і 24 спартсмены са Светлагорска, Калінкавіч, Рэчыцы, Жлобіна, Добруша, Чачэрска і Кармы.**

«Гомель быў абраны невыпадкова — менавіта тут пачыналі сваю баскетбольную кар'еру лідары нашых камандаў Настасся і Уладзімір Верамеенкі, Аляксандр Семянюк і Андрэй Рагозенка. Рэгіён славіцца сваімі рослымі і фізічна моцнымі гульцамі, а гэта гаворыць аб тым, што спецыялістамі праводзіцца вялікая работа па селекцыі і навучанні дзяцей у групах пачатковай падрыхтоўкі. Спадзяёмся, што семінары будуць карысныя для трэнераў усіх рэгіёнаў, а найлепшыя спартсмены праз некалькі гадоў папоўняць рады маладзёжных нацыянальных камандаў. Таксама найлепшыя гульцы ў будучым будуць рэкамендаваныя для залічэння ў вучылішча алімпійскага рэзерву», — расказала **генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола Настасся МАРЫНІНА.**



Фота Беларускай федэрацыі баскетбола.

Сёлета мэтавай аўдыторыяй праекта «Крок у будучыню» сталі трэнеры, якія працуюць з юнымі баскетбалістамі. Па словах Настассі Марынінай, гэтыя трэнеры — самыя галоўныя кавалі баскетбольных талентаў: «Усім трэнерам былі падрыхтаваны і выдадзены метадычныя матэрыялы, якія яны могуць выкарыстоўваць у сваёй рабоце. Тут нам вялікую дапамогу аказалі калегі з Расійскай Федэрацыі, якія прапанавалі сучасныя і якасныя дапаможнікі. Зараз таксама ажыццяўляецца пераклад і сербскага падручніка, які таксама атрымаюць усе ўдзельнікі семінараў».

Практычныя і тэарэтычныя заняткі праводзіць сербскі спецыяліст **Златан ПРЭШЫЧ — галоўны трэнер беларускай жаночай нацыянальнай каманды U-18, трэнер баскетбольнага клуба «Гарызонт».** Раней пад яго кіраўніцтвам ужо была рэалізавана праграма ФІБА Еўропа «Яе свет, яе правілы», накіраваная на дзяўчынак 2007—2008 гадоў нараджэння, па выніках якой для навучання ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі былі адабраны найлепшыя гульцы.

«Я і хацеў бы падзякаваць Беларускай федэрацыі баскетбола і прадстаўнікам Гомеля, якія прымаюць удзел у арганізацыі мерапрыемства. Упэўнены, што трэнеры атрымалі магчымасць не толькі папоўніць свае веды аб баскетболе, але і абмяняцца вопытам, падзяліцца ідэямі і абмеркаваць праблемныя пытанні. Для дзяцей семінар стаў добрай матывацыяй для далейшых заняткаў баскетболам», — адзначыў Златан Прэшыч.

Наступны семінар 21—22 лютага прыме Гродна. Затым семінары адбудуцца ў Брэсце, Віцебску, Магілёве, Маладзечне і Мінску. Кульмінацыяй чарговага этапу праекта «Крок у будучыню» стане вялікі кэмп, куды будуць запрошаны найбольш перспектыўныя спартсмены, якіх адбярэ група экспертаў.

Праект «Крок у будучыню» ўжо даўно пакарыў сэрцы беларускіх баскетбалістаў. У яго межах у 2018 і 2020 гадах былі праведзены два маштабныя фестывалі баскетбольнага майстэрства, якія прайшлі на сталічных арэнах Falcon Club Арэна і ў Палацы спорту. Летам і восенню 2019 года ў Валожыне і Мінску былі арганізаваны трэніровачныя лагеры для дзяцей, дзе галоўнымі лектарамі выступілі амерыканскія спецыялісты Крыс Дыял і Джасцін Бэры. У 2020 годзе «Крок у будучыню» быў зроблены на маштабных фестывалях па баскетболе 3х3 на базе адпачынку «Прывал» і ў аздараўленчым лагеры «Зялёны Бор», а таксама на эстафеце баскетбольнага майстэрства «Баскетбол на Каляды» ў Магілёве.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Дыялогавая пляцоўка

# ШЧЫРА АБ НАБАЛЕЛЫМ

## Міністр працы і сацыяльнай абароны сустрэлася з воінамі-афганцамі

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ сустрэлася з ветэранамі-афганцамі. Пытанні сацыяльнай падтрымкі і пенсійнага забеспячэння, прысваення груп інваліднасці, сацыяльнага адпачынку, ільготнага праезду ў транспарце і ўмоў набыцця і валодання асабістым транспартам — гэтыя і іншыя праблемы абмеркавалі ўдзельнікі сустрэчы. Яна прайшла ў межах дыялогавых пляцовак і была прымеркавана да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і Дня абаронцаў Айчыны.**



15 лютага 1989 года завяршыўся вывад савецкіх войскаў з Афганістана. Каля 29 тысяч беларусаў удзельнічала ў той вайне. За дзевяць гадоў Беларусь страціла каля 700 чалавек, чацвёра беларусаў атрымалі званні Герояў Савецкага Саюза. На сёння ў Беларусі жыве 24 тысячы ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых краін, у тым ліку больш за 22 тысячы ветэранаў вайны ў Афганістане.

Ірына Касцевіч звярнула ўвагу, што напярэдадні Усебеларускага народнага сходу яна атрымала больш за 260 зваротаў ад розных катэгорый насельніцтва.

— Я рэгулярна сустракаюся з рознымі сацыяльнымі групамі — з пажылымі людзьмі, шматдзетнымі сем'ямі, з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Рада, што такая сустрэча адбываецца і з вамі, бо ад воінаў-інтэрнацыяналістаў я таксама атрымліваю звароты. Адзін з іх нават адклала і хачу пачуць ваша меркаванне, бо, магчыма, маё рашэнне змяніцца, — адзначыла Ірына Касцевіч. — Я разлічваю, што вы агучыце ўсе пытанні, якія вас непакояць, усё набалелае, і абяцаю, што ўсе яны будуць разгледжаны.

Падчас сустрэчы падніманіся і пытанні павышэння пенсій, у прыватнасці, інвалідам, якія не маюць працоўнага стажу, — яны, як правіла, страцілі працаздольнасць у маладым узросце падчас баявых дзеянняў. Ірына Касцевіч заўважыла, што такое рашэнне будзе не зусім справядлівым у адносінах да тых пенсіянераў, якія адпрацавалі па 40 і больш гадоў.

— Пенсія — гэта не проста выплата па ўзросце, а найперш узнагарода за працу, — адзначыла яна.

Пытанні тэрміну лячэння ў стацыянары, прысваення груп інваліднасці і ўстаноўкі зубных пратэзаў для ветэранаў вайны ў Афганістане Ірына Касцевіч паабяцала разгледзець на сумеснай сустрэчы з прадстаўнікамі Міністэрства аховы здароўя. У сваю чаргу, міністр пацікавілася меркаваннем прысутных пра больш ранні выхад на пенсію ўдзельнікаў баявых дзеянняў. Намеснік старшыні Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, кіраўнік Асацыяцыі інвалідаў воінаў-інтэрнацыяналістаў Сяргей Красоўскі агучыў агульнае меркаванне, што гэта актуальна для тых, хто атрымаў раненні, але не мае групы інваліднасці (або адмовіўся ад яе ў маладосці, або не мае дакументальных пацвярджэнняў факта ранення). І пры гэтым стан здароўя ўжо не дазваляе працаваць.

Было на парадку дня і пытанне падтрымкі грамадскіх аб'яднанняў ветэранаў, удзельнікі і кіраўнікі якіх за ўласныя сродкі арганізуюць мерапрыемствы па патрыятычным выхаванні моладзі ў школах, гімназіях, ліцэях, вайсковых часцях, выязджаюць у іншыя гарады, дзе праводзяць сустрэчы, афармляюць выстаўкі ў навучальных установах і музеях.

Міністр падкрэсліла, што вядзецца дапрацоўка закона «Аб ветэранах». І ў першым квартале бягучага года гэта работа будзе актывізавана. Усе прапановы, якія паступілі, будуць разгледжаны. У міжведамаснай групе па прапрацоўцы канцэпцыі новай рэдакцыі закона, створанай пры Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, удзельнічае і Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане.

Напрыканцы сустрэчы Ірына Касцевіч падзякавала ўсім удзельнікам, павіншавала з надыходзячым Днём абаронцы Айчыны і ўручыла падарункі на памяць аб сустрэчы:

— У дні гэтых лютаўскіх свят я заўсёды з гонарам і павагай гляджу на людзей у пагонах. Гэта мужчыны асаблівай адказнасці і дысцыпліны. Хтосьці атрымаў раненне, страціў здароўе, але, нягледзячы ні на што, яны настроены на пазітыў.

Аб'ём мер падтрымкі ўдзельнікаў, ветэранаў і інвалідаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых краін, іх сем'яў залежыць ад ступені страты здароўя ў сувязі з выкананымі задачамі.

Для ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў з ліку ваеннаслужачых устаноўлена павышэнне памераў пенсій на 250 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце (з 1 лютага гэтая сума складае каля Br164), ільготнае падаткаабкладанне, а таксама гарантыі ў галіне працоўных адносін (дадатковыя адпачынкі, пераважнае захаванне рабочага месца пры іншых роўных умовах пры скарачэнні колькасці і штату работнікаў, навучанне новым прафесіям, выплата спецыяльных стыпендый).

Інвалідам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых краін даюцца льготы і гарантыі, прадугледжаныя для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Асноўныя — гэта бясплатнае забеспячэнне лекамі і тэхсродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, санаторна-курортнае лячэннем і аздараўленнем, бясплатны праезд у гарадскім і прыгарадным транспарце, 50-працэнтная скідка пры аплаце тэхабслугоўвання і камунальных паслуг, паслуг сувязі.

Непрацуючым ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых краін з ліку ваеннаслужачых, якія атрымалі раненне, кантузію або калецтва ў перыяд баявых дзеянняў, выдзяляюцца бясплатныя лекі і тэхсродкі сацыяльнай рэабілітацыі з зацверджанага Міністэрствам аховы здароўя пераліку, даецца права на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, бясплатны праезд у пасажырскім транспарце.

Ветэраны баявых дзеянняў, якія сталі інвалідамі з прычыны ранення, кантузіі або калецтва пры выкананні воінскіх абавязкаў, могуць на пяць гадоў раней за надыход агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту сысці на заслужаны адпачынак. Для іх жа прадугледжана павышэнне памераў пенсій: інвалідам I і II групы — на 400 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце (каля Br263), III групы — на 250 % (каля Br164). У такім жа памеры ўстаноўлена павышэнне пенсій і ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў.

Бацькам і жонкам (якія не ўзялі новы шлюб) ваеннаслужачых, смерць якіх звязана з выкананнем абавязкаў ваеннай службы, пенсійныя выплаты павышаны на 180 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце — каля Br118. Дзецям-інвалідам, а таксама бацькам і ўдовам інвалідаў, памерлых з прычыны ранення, кантузіі або калецтва, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, памер выплаты павышаны на 100 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце — каля Br65.

Акрамя таго, названым вышэй катэгорыям аказваецца дзяржпадтрымка на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

На слыху

# НЕ ДАПУСЦІЦЬ НЕАБГРУНТАВАНАГА РОСТУ

## У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні маніторынгу цэн на лекі

**Пытанні маніторынгу цэн на лекі абмеркавалі ўчора ў Савеце Рэспублікі на пашыраным пасяджэнні з удзелам старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяны РУНЕЦ. Як не дапусціць неабгрунтаванага росту цэн, разбіраліся не толькі прадстаўнікі верхняй палаты парламента, міністэрстваў антыманапольнага рэгулявання і гандлю, аховы здароўя, але і фармвытворцы, і кіраўніцтва аптэчных сетак.**

Як адзначыла Таццяна Рунец, паводле статыстыкі за студзень цэны на лекі выраслі на 4,6 %. Наколькі гэта абгрунтавана і звязана з ростам ПДВ, яшчэ неабходна высветліць як органам дзяржкантролю, так і сенатарам.

— Сенатарскі корпус ва ўсіх рэгіёнах падключаецца да маніторынгу цэн на лекі. Але зараз мы ставім задачу не проста паглядзець цэны ў аптэках. На мой погляд, трэба вырашаць задачу комплексна — шукаць кампрамісы з вытворцамі. Яшчэ адзін важны момант — работа з дыстрыб'ютарамі і імпарцёрамі. Як вядома, нярэдка дзейнічаюць пасрэдніцкія ланцужкі, што таксама ўплывае на канчатковую цану. Таму сенатарскі корпус у рэгіёнах, дзе працуюць фармвытворцы, будзе падключацца да аналізу іх фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

Сенатар падкрэсліла, што пры гэтым стаіць задача не нашкодзіць і прадпрыемству:

— Дзяржаўнае рэгуляванне цэн мы павінны праводзіць комплексна, вывучаючы ўсе аспекты, каб і вытворчасць не стала стратнай. У той жа час нельга дапусціць скарачэння асартыменту лекаў на рынку, каб не ўтварыўся дэфіцыт. Гэта няпросты працэс, але мы справімся з гэтай задачай.

**Намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ЧАРАДНІЧЭНКА** адзначыў, што, акрамя недапушчэння росту цэн, яшчэ адной задачай з'яўляецца абарона малазабяспечаных груп насельніцтва і людзей з невялікімі даходамі.

— Яны павінны мець доступ да лекавых прэпаратаў, якія запатрабаваны і неабходны. Пры некаторых захворваннях пэўныя прэпараты пацыенты мусяць прымаць штодзень. У нас каля 500 тысяч грамадзян, якія па сваім захворванні атрымліваюць лекавыя прэпараты бясплатна. Гэта вялікая група, і лекі ім аплачвае дзяржава. Сумесна з МАРГ, Міністэрствам фінансаў, прадстаўнікамі Савета Рэспублікі, кантрольнымі органамі, фармрынкам мы павінны гарантаваць лекавую бяспеку краіны.

Дзмітрый Чараднічэнка падкрэсліў, што палітыка Міністэрства аховы здароўя накіраваная на тое, каб усе гульцы фармрынку былі ў роўных умовах — і прыватныя кампаніі, і дзяржаўныя аптэчныя сеткі.

— Мы за тое, каб на рынку прысутнічалі не толькі айчынныя прэпараты. З задачай павелічэння іх колькасці мы ў свой час справіліся. Але, зразумела, павінны быць і прэпараты імпартнай вытворчасці, якія не вырабляюцца ў нашай краіне. Вельмі важна забяспечыць наяўнасць арыгінальных прэпаратаў, бо хтосьці прыхільнік біяналага, а хтосьці — толькі арыгінальнага варыянта. Нельга дапусціць, каб зніклі з рынку прэпараты, якія прызвычаіўся прымаць пацыент.

Намеснік міністра паведаміў, што ў гэтым кірунку Міністэрства аховы здароўя правяло работу па спрошчанай і ўмоўнай рэгістрацыі лекавых сродкаў.

— Спрошчаная рэгістрацыя працуе нядоўга — каля двух месяцаў, але ўжо 30 новых прэпаратаў прыйшло на рынак нашай краіны па спрошчанай схеме. З'яўляюцца прэпараты і па ўмоўнай рэгістрацыі, і гэта палёгка для вытворцаў. Мы змяншаем некаторыя этапы кантролю якасці, якія ўплываюць на цану. Гэтыя прэпараты шматразова правераны заводам-вытворцам, маюць не толькі адпаведную рэпутацыю, але і задакументаваныя сертыфікаты якасці, адпаведнасці і іншае.

Намеснік міністра адзначыў, што аптэкі атрымалі магчымасць пашырыць асартымент, дзякуючы БАДам, спартыўнаму харчаванню і іншым спадарожным таварам. Нядаўна пашыраны пералік безрэцэптурнага водпуску, арганізаваны інтэрнэт-гандаль некаторымі безрэцэптурнымі прэпаратамі, які будзе зацверджаны на пастаяннай аснове пасля нармалізацыі эпідэмічнай сітуацыі.

Летась у Беларусі ўпершыню з'явілася і так званая сістэма раздзялення рызык. Згодна з ёй, краіна плаціць замежнай фармакалагічнай кампаніі толькі за тыя прэпараты і тых пацыентаў, якім лячэнне дапамагло. Найперш гэта датычыцца таргетных прэпаратаў у анкалогіі. Яны падбіраюцца індывідуальна ў залежнасці ад віду пухліны і на сёння з'яўляюцца адным з самых эфектыўных сродкаў лячэння раку.

— Сістэма раздзялення рызык у нашай краіне з'явілася ўпершыню. Але гэта сусветная практыка, і мы будзем яе працягваць, — падкрэсліў Дзмітрый Чараднічэнка.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# ЗА ШТО БУДУЦЬ І НЕ БУДУЦЬ ШТРАФАВАЦЬ

## ЗА ГЭТА ЎЖО НЕ ШТРАФУЮЦЬ

Пачнём з добрых навін. За што цяпер не будуць штрафаваць? Папярэджанне замест штрафу атрымаюць кіроўцы, якія не прышпіліліся за рулём, ездзяць без тэхагляду, з нечытэльнымі або нестандартнымі нумарамі, — калі ў гэтым былі заўважаны ўпершыню. Таксама штрафаваць па першым разе не будуць за парушэнне правіл буксіроўкі транспартнага сродку і за невыстаўленне знака падчас паломкі. Але папярэджанне будзе ўнесена ў базу даных, і другі раз за тую ж самую правіннасць кіроўца атрымае ўжо штраф. Так, штрафам, у прыватнасці, будуць караць такія правіннасці, учыненыя паўторна на працягу года, як размова па тэлефоне падчас кіравання транспартным сродкам, парушэнне правіл перавозкі пасажыраў і непрадастаўленне перавагі падчас руху.

— Калі правіннасць здзейснена ўпершыню на працягу года і кіроўца прызнаў сваю віну, яму выносіцца папярэджанне, — адзначае **начальнік аддзялення забеспячэння правапрымяняльнай дзейнасці галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Аляксандр ШАЎЧЭНКА.** — Калі на працягу года ён больш не здзяйсняе такога парушэння, то папярэджанне ануляецца.

Ёсць таксама 17 адміністрацыйных правіннасцяў (адна з іх — безбілетны праезд, астатнія датычацца парушэнняў ПДР), за якія штрафаваць будуць, нават калі яны здзейснены ўпершыню. Гэта ўсе парушэнні хуткаснага рэжыму, правіл праезду чыгуначнага пераезда, невыкананне патрабаванняў святлафора або рэгуліроўшчыка, правіл манеўрыравання. Да такіх правіннасцяў адносяцца таксама парушэнне правіл праезду скрыжаванняў і правіл руху ў жылых зонах. А таксама парушэнне Правіл дарожнага руху веласіпедыстам або асобай, якая ўдзельнічае ў руху і не кіруе транспартным сродкам, што пацягнула за сабой стварэнне аварыйнай абстаноўкі.

## «ЛІСТОЎ ШЧАСЦЯ» СТАНЕ БОЛЬШ

Пашыраны спіс парушэнняў ПДР, за якія будуць штрафаваць па сведчаннях камер, што працуюць у аўтаматычным рэжыме. Цяпер «лісты шчасця» будуць прыходзіць не толькі за перавышэнне хуткасці і парушэнне правіл прыпынку і стаянкі, але і за праезд на чырвоны сігнал святлафора, прыпынак за стоп-лініяй, праезд па паласе, прызначанай для грамадскага транспарту, і шэраг іншых парушэнняў.

Распрацоўваюцца новыя Правілы дарожнага руху, расказалі ў ДАІ. І, у прыватнасці, на вуліцах беларускіх гарадоў хутка з'явіцца новая для нашай краіны разметка (на дарогах суседняй Расіі яна ўжо ёсць). Новая разметка дазволіць скараціць колькасць неправамерных выездаў на скрыжаванне (напрыклад, падчас затораў), лічаць у ДАІ.

— Новая разметка патрэбна для прадухілення блакіравання скрыжавання аўтамабілямі ва ўмовах высокай транспартнай нагрузкі, — пракаментавалі ў Галоўным упраўленні ДАІ МУС. — Прыклад: скрыжаванне Незалежнасці — Энгельса ў Мінску. Тут часта застаецца «хвост» з аўтамабіляў па праспекце Незалежнасці, што блакіруе вуліцу Энгельса. Каб гэтага не адбывалася, наносіцца новая разметка, якая інфармуе кіроўцаў аб неабходнасці спыніцца перад скрыжаваннем. Спыняцца на гэтай разметцы нельга. Калі пры змене сігналаў рэгулявання хтосьці застаўся на ёй, будзе штраф.



## ГРАДАЦЫЯ АДКАЗНАСЦІ

За перавышэнне хуткасці кіроўцаў штрафуюць заўсёды і ўсюды, і да гэтага аўтамабілісты ўжо прывыклі. Новы кодэкс уводзіць дадатковую градацыю перавышэння хуткасці. Так, калі хуткасны рэжым перавышаны на 30-40 км/г, то штраф будзе вар'іравацца ў межах 3-10 базавых велічынь. Калі перавышэнне хуткасці больш значнае, штраф складзе 8-12 базавых велічынь.

— Перавышэнне хуткасці — адна з асноўных прычын ДТЗ з гібеллю і траўматызмам грамадзян, — кажа Аляксандр Шаўчэнка. — І чым вышэйшая хуткасць, тым больш сур'ёзныя могуць быць наступствы. Дэталёвая градацыя адказнасці за перавышэнне хуткасці існуе ў Расіі, у Еўропе наогул штрафуюць літаральна за кожны кіламетр перавышэння хуткаснага рэжыму. Магчыма, у далейшым такая градацыя і ў нашай краіне стане яшчэ больш падрабязнай, — падкрэсліў спецыяліст.

Таксама з'явіцца градацыя пакарання, калі кіроўца нецвярозы. Так, калі пробы паказваюць 0,3-0,8 праміле, штраф складзе 100 базавых велічынь і прадугледжана пазбаўленне правоў на кіраванне транспартным сродкам на тры гады. Пры больш моцным ап'яненні штраф складзе 200 базавых, а правоў пазбавяць на пяць гадоў.

— Мы разлічваем, што гэтыя меры — узмацненне адказнасці за нецвярозае кіраванне і яе дыферэнцыяцыя — дазволяць мінімізаваць верагоднасць з'яўлення падобных фактаў на нашых дарогах, — гаворыць Аляксандр Шаўчэнка.

У ДАІ адзначаюць, што п'яных за рулём у апошнія гады стала значна менш — калі 8-10 гадоў таму ў год фіксавалася да 60 000 такіх выпадкаў, то ў 2020 годзе — 18,5 тысячы.

— Падзейнічалі меры, што прымаліся намі раней, — канстатуе спецыяліст. — Колькасць падобных парушэнняў скарацілася больш чым на дзве трэці, але цяпер мы выйшлі на пэўнае плато ў гэтым пытанні. Таму спатрэбіліся дадатковыя крокі, якія дазволяць яшчэ больш скараціць, а з часам і наогул выкараніць гэтую з'яву на нашых дарогах.

Адзначым, што 0,3 праміле алкаголю адпавядае адной бутэльцы піва, выпітай перад тым, як сесці за руль. Суразмоўца распавёў, што дыферэнцыяцыя адказнасці за нецвярозае кіраванне дазволіць даць шанц тым, хто спатыкнуўся ўпершыню, не паўтараць такое парушэнне.

Яшчэ адно новаўвядзенне — падзел адказнасці за кіраванне транспартным сродкам без тэхагляду і страхоўкі. З 1 сакавіка за тое, што аўто ўдзельнічае ў дарожным руху без ТА і абавязковай страхоўкі, будзе адказваць уладальнік аўтамабіля, а не яго кіроўца. Гэта новаўвядзенне ў першую чаргу датычыцца юрыдычных асоб.

## І ІНШЫЯ НОВАЎВЯДЗЕННІ

У новых КаАП і ПВКаАП цалкам чакана замацавана адказнасць «за парушэнне правіл карыстання гукавымі сігналамі ў месцах правядзення масавых мерапрыемстваў». За гэта цяпер прадугледжаны штраф да 10 базавых велічынь з пазбаўленнем правоў на год (або без пазбаўлення правоў). За наўмыснае блакіраванне транспартных камунікацый пры правядзенні масавых мерапрыемстваў прапісаны штраф ад 6 да 50 базавых велічынь, магчыма таксама пазбаўленне правоў на год ці на два гады. А кіроўцы, што неаднаразова праігнаравалі патрабаванне інспектараў ДАІ аб спыненні, караюцца адміністрацыйным арыштам.

**Дзіяна РОНІНА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


**И З В Е Щ Е Н И Е о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Гостиница «Могилев», 22 марта 2021 года**

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., коп. (с учетом НДС) | Размер задатка, бел. руб., коп. | Характеристика объекта | Условие аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение № 2 с инвентарным номером 700/D-155765, общей площадью 83,3 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Мира, 6-5а | 522 790 руб. 80 коп. | 26 140 руб. 00 коп. | Наименование – изолированное помещение № 2, назначение – торговое помещение. Помещение расположено на 1-м этаже здания гостиницы «Могилев». Стены – кирпичные, железобетонные; перегородки – кирпичные; перекрытия – железобетонные; полы – плитка; проемы оконные – алюминиевый профиль, дверные – ПВХ-профиль, деревянные изделия. Имеется центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация | Без условий |

**Аукцион состоится 22 марта 2021 года в 15.00 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.**
Заявки принимаются ежедневно с 19 февраля 2021 г. в рабочие дни с 8.17 (обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 19 марта 2021 года до 13.00.** Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона – **22 марта 2021 года** с 14.30 до 15.00.

Продавец: ОАО «Гостиница «Могилев», 212030, г. Могилев, пр-т Мира, 6, тел.: (80222) 72-42-91, 72-41-45.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Гостиница «Могилев».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;

- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- **иностранным юридическим лицом –** легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- **иностранным индивидуальным предпринимателем –** легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- **представителем юридического лица Республики Беларусь –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь –** нотариально удостоверенная доверенность:

- **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя –** доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона в установленном порядке в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Условия и порядок оплаты – оплата стоимости предмета аукциона, приобретенного на аукционе, производится путем перечисления денежных средств на текущий (расчетный) банковский счет продавца – в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи – в размере 50 % цены продажи предмета аукциона, оставшиеся 50 % – в течение 90 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

Дополнительная информация – в случае уменьшения официального курса белорусского рубля, установленного Национальным банком Республики Беларусь по отношению к доллару США на дату платежа более чем на 2 % по сравнению с официальным курсом белорусского рубля, установленного Национальным банком Республики Беларусь к доллару США по состоянию на 19.02.2021 г. цена продажи предмета аукциона, подлежащая уплате, пересчитывается.

С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 базовых величин: **победителем аукциона –** в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; лицом, **приравненным к победителю аукциона, –** в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона –** в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: (0222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

19 лютага 2021 г. № 6 (591)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ



Фота БелТА.

# ПАСТАЯННЫ ДЫЯЛОГ І БЕЗБАР'ЕРНАЯ КАМУНІКАЦЫЯ

**Днямі старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ў чарговы раз наведала Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.**

Гэтым разам яна сустрэлася з кіраўніцтвам, дэканамі факультэтаў, прадстаўнікамі прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікамі розных службаў і структурных падраздзяленняў вядучай навучальнай установы краіны.

Прычыну свайго візіту Наталля Качанава растлумачыла наступным чынам. Яна — упаўнаважаная па Мінску, а значыць, усё, што адбываецца ў сталіцы, ад эканомікі да грамадска-палітычнай сітуацыі, непасрэдна звязана з яе работай. Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі ўжо, як вядома, неаднаразова сустракалася і вяла дыялог са студэнтамі Белдзяржуніверсітэта. І вось, калі аднойчы на прыёме па асабістых пытаннях да яе звярнуліся прадстаўнікі ўніверсітэта з прапановай убачыцца менавіта з супрацоўнікамі БДУ, яна прыняла гэтае запрашэнне, патлумачыла спікер верхняй палаты парламента.

Размова адбылася ў рэжыме «пытанне — адказ». Такую схему сустрэчы прапанавала сама старшыня Савета Рэспублікі як больш зручную ў дадзены момант, каб данесці сваю пазіцыю да прысутных, і спрыяльную для плённага абмеркавання надзённых праблем. Наталля Качанава дала грунтоўныя адказы на тыя пытанні, якія хвалююць не толькі выкладчыцкія кадры БДУ, але і, відаць, прадстаўнікоў усёй універсітэцкай супольнасці Беларусі.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль у размове з журналістамі адзначыў, што такія сустрэчы — магчымасць на высокім узроўні абмеркаваць актуальныя пытанні. На яго думку, невыпадкова апошнім часам аддаецца вялікая ўвага выхаванню моладзі. Яскравы прыклад — VI Усебеларускі народны сход. Там у цэлым было шмат сказана і кіраўніком дзяржавы, і іншымі выступоўцамі пра неабходнасць удасканалення і паляпшэння работы з юнакамі і дзяўчатамі. Недарэмна на сходзе былі пастаўлены сур'ёзныя задачы па вырашэнні праблем у гэтай сферы.

Паводле слоў рэктара, сёння супрацоўнікамі БДУ робіцца шмат для таго, каб выбудаваць паўнавартасны і рэальны дыялог паміж усімі прадстаўнікамі ўніверсітэцкай супольнасці, нават быць на крок наперадзе ў параўнанні з іншымі дзяржаўнымі ўстановамі. Бо універсітэцкае асяроддзе вельмі разнароднае і featureнабаковае. І само яго існаванне мае на ўвазе правядзенне актыўнага дыялогу. Што датычыцца Белдзяржуніверсітэта, то там сёння любы супрацоўнік ВНУ ці студэнт заўсёды могуць прыйсці да дэкана, прарэктара, рэктара і абмеркаваць пытанні, якія непакояць маладых людзей. З імі выкладчыкі ўніверсітэта імкнуцца весці пастаянны дыялог у рамках безбар'ернай камунікацыі, каб не было непаразуменняў. Іншая справа, што сучасная грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне і свеце прадугледжвае больш шчырую размову паміж усімі прадстаўнікамі ўніверсітэцкай супольнасці. У кіраўніцтва БДУ ёсць разуменне таго, дзе існуюць «болевыя» пункты. Тут ёсць над чым папрацаваць. У БДУ імкнуцца знаходзіць эфектыўныя падыходы ў падрыхтоўцы сучасных кадраў вышэйшай кваліфікацыі, адзначыў Андрэй Кароль.

Сёлета, як вядома, адбудзецца святкаванне 100-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па словах яго рэктара, зараз ідзе актыўная падрыхтоўка да юбілею: выдаюцца кнігі, ладзяцца канферэнцыі, ідзе развіццё інфраструктуры навучальнай установы, абнаўленне яе матэрыяльна-тэхнічнай базы. У стадыі завяршэння многія іншыя цікавыя і змястоўныя мерапрыемствы. Штомесяц збіраецца аргкамітэт з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў.

У краіне юбілею БДУ надаецца маштаб нацыянальнага значэння, што і зразумела. Гэта наш першы ўніверсітэт, у якім навучаецца больш за 30 тысяч маладых людзей: студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і дактарантаў. У іх ліку 4074 замежнікі з 62 краін. Толькі кітайскіх студэнтаў каля 1800. Сёння ў штаце ўніверсітэта амаль 8 тысяч супрацоўнікаў. Сярод іх 6 акадэмікаў, 10 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, больш за 300 дактароў навук і прафесараў, звыш 1,3 тысячы кандыдатаў навук.

У БДУ ўкараняюцца сучасныя метады адукацыі, выкарыстоўваюцца інавацыйныя тэхналогіі навучання, пастаянна ўдасканальваецца дзейнасць 17 факультэтаў, 177 кафедраў, 4 адукацыйных інстытутаў, 6 навукова-даследчых інстытутаў, 41 навукова-даследчай лабараторыі і г. д. Фонд фундаментальнай бібліятэкі БДУ налічвае каля двух мільёнаў тамоў айчыннай і замежнай літаратуры. А электронная бібліятэка БДУ мае высокі статус у Еўропе.

З пачатку існавання БДУ выпусціў каля 185 тысяч спецыялістаў, падрыхтаваў 4,7 тысячы кандыдатаў навук, 700 дактароў навук, больш за 15 тысяч замежных спецыялістаў. Сёння ўніверсітэт прадстаўлены ў 12 глабальных і 7 прадметных сусветных рэйтынгах, удзельнічае ў 37 міжнародных адукацыйных праектах, уваходзіць у 13 міжнародных асацыяцый. З універсітэтамі 59 краін у БДУ падпісаны 566 пагадненняў.

Праграма святкавання юбілею ўніверсітэта ўключае 100 розных па змесце і фармаце правядзення мерапрыемстваў, якія, як спадзяюцца ва ўніверсітэце, не застануцца незаўважанымі грамадскасцю сталіцы, краіны і за яе межамі, у тым ліку калегамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

АКТУАЛЬНА

## Наўмысная палітызацыя не дазваляе Еўрапарламенту бачыць галоўнае

**Рэзалюцыя Еўрапарламента па Беларускай АЭС у чарговы раз прадэманстравала поўнае нежаданне еўрадэпутатаў аб'ектыўна ацаніць міжнародны праект па будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Беларусі.**

Такое меркаванне выказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**, паведаміла прэс-служба верхняй палаты парламента.

— Не чакаючы высноў каманды еўрапейскіх рэгулятараў аб прымаемых на станцыі мерах бяспекі, еўрадэпутаты дазволілі сабе ўключыць у рэзалюцыю заведама недакладную інфармацыю, падмяніўшы гэтым кампетэнтнае меркаванне профільных міжнародных і еўрапейскіх устаноў — МАГАТЭ і Групы еўрапейскіх рэгулятараў ядзернай бяспекі, надзяліўшы сябе без усялякіх на тое падстаў правам судзіць аб глыбока тэхнічных аспектах у гэтай спецыфічнай сферы, — падкрэсліў старшыня профільнай камісіі.

Сяргей Рачкоў перакананы, што наўмысная палітызацыя будаўніцтва БелАЭС не дазваляе Еўрапарламенту бачыць галоўнае: Беларусь сваімі паслядоўнымі дзеяннямі дэманструе прыхільнасць да палітыкі адкрытага і прафесійнага дыялогу з усімі зацікаўленымі краінамі і профільнымі арганізацыямі для забеспячэння глабальнай ядзернай бяспекі ў цэлым і ўстойлівай эксплуатацыі Беларускай АЭС у прыватнасці.

— Упэўнены, што развіццё атамнай энергетыкі ў Беларусі зробіць значны ўклад у скарачэнне выкідаў парніковых газаў і, адпаведна, у рэалізацыю Парыжскага пагаднення, — дадаў ён.

СТАЛІЧНЫ ЧАС

## Высновы, задачы і перспектывы

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна неабходна шырока асвятляць

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ узяла ўдзел у пасяджэнні адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска.**

Асноўнае пытанне на парадку дня — абмеркаванне вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Маскоўскага раёна сталіцы за мінулы год і задачы на бягучы.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, выступаючы па пытанні аб выніках дзейнасці і рэалізацыі даведзеных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, сенатар звярнула ўвагу на недапушчальнасць росту колькасці стратных прадпрыемстваў.

— Неабходна з кожнай арганізацыяй праводзіць работу па выяўленні прычын страт і прымаць меры па іх скарачэнні. Акрамя таго, выклікае заклапочанасць наяўнасць знешняй дэбіторскай запазычанасці, у тым ліку пратэрмінаванай у ТАА «АСБ Лізінг», РУП «Белмедпрэпараты» і іншых, — акцэнтавала яна ўвагу.

У цэнтры ўвагі на пасяджэнні таксама былі разгледжаны тэма выканання капітальных рамонтаў летась і задачы ў гэтым кірунку на бягучы год.

Трэба сказаць, што дзейнасць службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна па выкананні ўстаноўленага на 2020 год задання па капітальным рамонце жыллёвага фонду, замене ліфтавага абсталявання і асваенні бюджэтных асігнаванняў прызнана здавальняючай.

Старшыня Пастаяннай камісіі засяродзіла ўвагу прысутных і на неабходнасці больш шырокага асвятлення ў сродках масавай інфармацыі і інтэрнэт-рэсурсах дасягненняў Маскоўскага раёна ў эканамічным і сацыяльным развіцці сталіцы, прыкладаў добраўпарадкавання тэрыторый і жыллёвага фонду, аказання дапамогі насельніцтву.

СЛОВА — УДЗЕЛЬНІКАМ

## «У АДЗІНСТВЕ МЫ ЗМОЖАМ РЭАЛІЗАВАЦЬ ВЫЗНАЧАНУЮ СТРАТЭГІЮ»



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна АБЕЛЬ** аб выніках VI Усебеларускага народнага сходу:

— Адбылася галоўная падзея года — Усебеларускі народны сход. Мы разам вызначылі далейшы курс развіцця дзяржавы. Тэзісы, прынятыя падчас абмеркаванняў, стануць асновай Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на найбліжэйшыя пяць гадоў.

Удзел у гэтым сходзе прадстаўнікоў розных сфер занятасці дапамагае максімальна ўлічыць інтарэсы кожнага жыхара. З'яўляючыся дэлегатам у тым ліку папярэдняга народнага веча, рэальна ацэньваючы, што прынятыя пяць гадоў таму пастулаты былі ажыццёўлены, асабліва востра ўсведамляеш значнасць дадзенага мерапрыемства і абавязацельствы, ускладзеныя на дэлегатаў.

Двайная адказнасць на членах Савета Рэспублікі, бо наша асноўная задача — рабіць жыццё нашых грамадзян лепшым, ведаць і чуць праблемы і цяжкасці, актыўна дапамагаць іх вырашэнню.

Сёння як дэлегат і парламентарый я магу даць высокую ацэнку жыццяздольнасці прынятых палажэнняў і запэўніць, што ў адзінстве, разам з вамі мы зможам рэалізаваць вызначаную стратэгію, — адзначыла сенатар.

## ГАЛОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ РУХУ НАПЕРАД ЗАСТАЮЦЦА НЯЗМЕННЫЯ



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, галоўны рэдактар рагачоўскай раённай газеты «Свабоднае слова» Андрэй ШЫШКІН** падзяліўся ўражаннем ад удзелу ў VI Усебеларускім народным сходзе ў адной з сацсетак.

— Імгненна праляцелі два дні форуму. Шчыра кажучы, уражанні дагэтуль перапаўняюць. Што і зразумела, бо не часта чалавеку выпадае шанц стаць удзельнікам гістарычнай падзеі, якая мае вялікае значэнне як для сённяшняга, так і для заўтрашняга дня нашай краіны і народа.

Ключавым момантам УНС, бясспрэчна, сталі выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, якія прагучалі ў Палацы Рэспублікі 11 і 12 лютага. З уласцівай для беларускага лідара прастатой і шчырасцю ў іх была дадзена ацэнка няўдалай спробе беларускіх апазіцыянераў сілавымі метадамі захапіць уладу ў краіне, зроблены дакладны і ўсёабдымны аналіз бягучай грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі і свеце, падведзены вынікі мінулай пяцігодкі, падрабязна разгледжаны асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады.

Дарэчы, адабрэнне ўдзельнікамі УНС гэтага праграмнага дакумента — самая надзейная гарантыя таго, што развіццё краіны будзе ісці не рэвалюцыйным, а эвалюцыйным шляхам. Больш за тое, галоўныя прынцыпы гэтага руху наперад застаюцца ранейшыя — сацыяльна арыентаваная дзяржава і справядлівае грамадства.

А яго дарожная карта ўключае ў сябе такія важныя крокі, як правядзенне канстытуцыйнай рэформы, умацаванне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, заканадаўчае замацаванне асаблівага прававога статусу УНС.

Актуальна сёння гучыць дэвіз УНС — «Адзінства. Развіццё. Незалежнасць». Кожнае з гэтых слоў — неабходная ўмова выканання плана нашай агульнай перамогі, паспяховага руху па шляху, які выбралі беларусы на народным вечы.

**Наталля КАЧАНАВА:**

УЗНАГАРОДЫ — НАЙЛЕПШЫМ

# «Важна, што такіх, хто любіць Беларусь, горад і яго людзей, шмат»

**Урачыстая цырымонія ўзнагароджання актыву сталіцы прайшла ў Мінскай гарадской ратушы. У мерапрыемстве ўдзельнічалі старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ, паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны».**



Высокую ўзнагароду — падзячныя лісты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — атрымалі 111 прадстаўнікоў працоўных калектываў адміністрацый раёнаў і структурных падраздзяленняў Мінгарвыканкама, прадпрыемстваў і арганізацый сталіцы, устаноў адукацыі і аховы здароўя горада. Гэта жыхары сталіцы, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё і росквіт горада, маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю і з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі краіны.

— Перш за ўсё хачу падзякаваць вам за вашу грамадзянскую пазіцыю, за неабыякавасць і стаўленне да нашай краіны і народа, — звярнулася да ўдзельнікаў спікер верхняй палаты парламента, упаўнаважаная Прэзідэнта па Мінску. — Зусім нядаўна прайшоў Усебеларускі народны сход. Многія з вас сталі ўдзельнікамі гэтай важнай падзеі ў жыцці дзяржавы, дзе дакладна былі вызначаны задачы, якія стаяць перад актывам і грамадствам. І абсалютна правільна — перад кожным з нас. Мы павінны дакладна ўсвядоміць, што толькі ад кожнага з нас залежыць будучыня нашай краіны. І важна, што такіх, хто любіць Беларусь, горад і яго людзей, шмат. Нізкі паклон за ўсё, што вы робіце, кожны на сваім рабочым месцы.

Цырымонію ўручэння падзячных лістоў ад кіраўніка дзяржавы працягнуў мэр сталіцы. Творчыя нумары для гасцей падрыхтавалі заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Алена Ланская і Вікторыя Алешка.

# «ТОЛЬКІ НАРОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ МАЕ ПРАВА ВЫЗНАЧАЦЬ БУДУЧЫНЮ СВАЁЙ КРАІНЫ»

## Палітычныя дзеячы даслалі ўдзельнікам форуму словы падтрымкі

**Віншавальныя тэлеграмы ў адрас удзельнікаў і дэлегатаў шостага Усебеларускага народнага сходу адрасавалі палітычныя дзеячы іншых краін, прадстаўнікі розных аб'яднанняў і іх лідары, паведамілі «МС» у прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента.**

У прыватнасці, у прывітанні **старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянціны МАЦВІЕНКІ** падкрэслівалася, што Расія як надзейны сябар і саюзнік нязменна аказвала і будзе аказваць брацкаму беларускаму народу шматпланавую дапамогу, у тым ліку ў вырашэнні праблем, звязаных з пандэміяй каранавіруснай інфекцыі і яе сацыяльна-эканамічнымі наступствамі.

— Перад беларускім грамадствам на фоне сур'ёзных выклікаў стаяць надзвычай важныя задачы дынамічнага і ўстойлівага развіцця краіны, дасягненні грамадзянскага міру і згоды, удасканалення і развіцця канстытуцыйнага ладу, забеспячэння асноватворных правоў і свабод грамадзян. Глыбока перакананая, што народ Рэспублікі Беларусь, як гэта было ва ўсе часы, пераадолее ўсе гэтыя выклікі з апорай на агульнанацыянальныя каштоўнасці, на свой унікальны характар. Гэта адказная праца, якая патрабуе ўдзелу ўсіх слаёў грамадства, палітычных сіл і грамадскіх рухаў, прадстаўнікоў рэгіёнаў і бізнесу.

Народ Рэспублікі Беларусь можа цвёрда разлічваць на падтрымку Расіі ў рэалізацыі стваральнага парадку дня, у фарміраванні якога ключавую ролю будзе адыгрываць агульнанацыянальны форум — Усебеларускі народны сход. Упэўнена, што грамадзяне вашай краіны разам дастойна пераадолеюць гэты няпросты перыяд, прапануюць такія рашэнні, якія дадуць магчымасць забяспечыць стабільнае і мірнае жыццё кожнаму.

Толькі народ Рэспублікі Беларусь мае права вызначаць будучыню сваёй краіны. Жадаю ўдзельнікам VI Усебеларускага народнага сходу паспяховай работы на карысць народа Рэспублікі Беларусь, — гаворыцца ў прывітанні.

**Старшыня ЦК КПРФ, кіраўнік партыйнай фракцыі ў Дзяржаўнай думе Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Генадзь ЗЮГАНАЎ** таксама далучыўся да віншаванняў і выказвання цёплых слоў падтрымкі. У прыватнасці, лідар расійскіх камуністаў адзначыў у сваёй тэлеграме, што Усебеларускі народны сход стаў вялікім здабыткам Беларусі і рускага свету, зрабіў важкі ўнёсак у прамысловы рост, памнажэнне навуковага патэнцыялу, уладкаванне вёскі, моцную і дастойную адукацыю. Палітычны дзеяч выказаў удзячнасць за такі прыклад вялікай і стваральнай працы.

— Усім, хто выйшаў з-за меж нашай агульнай радзімы — СССР, вы далі прыклад беражлівых адносін да роднай зямлі, да сваёй гісторыі і свайго лёсу. Вы не дапусцілі алігархічнай вольніцы, крымінальнага разгулу і нацыяналістычных выкрутасаў, — заўважыў ён.

Генадзь Зюганаў прыгадаў у тэлеграме і падзеі жніўня-2020, што адбываліся ў нашай краіне:

— Беларусь перажыла складанае выпрабаванне, і мы згадваем аб ім з гонарам за беларускі народ — вы не толькі зрабілі прынцыповы выбар пры абранні Прэзідэнта, але і адстаялі сваё рашэнне: вы зрабілі гэта з вялікай годнасцю і сапраўдным усведамленнем каштоўнасцяў свабоды і справядлівасці, — падкрэсліў ён.

Не пакінуў па-за ўвагай кіраўнік расійскіх камуністаў і сённяшнія геапалітычныя падзеі: ён адзначыў, што найлепшыя якасці народнай свядомасці — працавітасць і мудрасць, калектывізм і развažлівасць, не напускны, а глыбінны патрыятызм.

— Гэтага ніколі не зразумеюць і не даруюць вам заходнія палітыканы. Устойлівасць Беларусі не дае ім спакою, — перакананы расійскі палітык. Ён звяртае ўвагу: прыхільнікі «новага парадку свету» робяць усё, каб падзяліць нашы народы. Але гэта, на яго пункт гледжання, азначае толькі адно: курс на адзінства Расіі і Беларусі — самы правільны, надзейны і перспектыўны.

— Нашым працаўнікам ніколі не зразумець, што гэты братэрскі саюз — не механічнае складанне тэрыторый, гэта нават не адзінства гаспадарчых сувязяў, гэта з'яднанне цэлага дзеля працягнення тысячагадовай гістарычнай традыцыі. Нашае самае маштабнае і глыбокае злучэнне — гэта вялікая агульная перамога над сусветным злом нацызму, — падкрэсліў лідар фракцыі.

У якасці прыкладу ён прывёў канферэнцыі ў падтрымку беларускага народа, што прайшлі ў маладзёжных аўдыторыях. У прыватнасці, «Расія — Беларусь: адны героі — адзін народ».

— Прыемна чуць з вуснаў маладога пакалення імёны нашых агульных герояў: бацькі Міная, лётчыка Мікалая Гастэлы, кавалерыста Льва Даватара, піянера Марата Казея, смелага партызана, выбітнага грамадскага дзеяча Пятра Машэрава. Гэта трэба ведаць, разумець, адчуваць: пакуль у нас адны героі — мы адзіны народ і непераможны. Як непераможныя былі ўдзельнікі аперацыі «Баграціён», што вызвалілі ад захопнікаў Белую Русь. Мы любім беларусаў і шануем нашы кроўныя сувязі, — падкрэсліў ён.

Працягваючы думку аб памяці Вялікай Перамогі, лідар расійскіх камуністаў не змог не згадаць сімвалы цяперашніх пратэстаў:

— Беларуская дзяржаўнасць — частка нашай агульнай гісторыі, і мы верым, што сімвалы здрадніцкага служэння фашызму ніколі не змогуць развявацца над прыгожай, добрай і годнай краінай.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, ён пажадаў братам-беларусам заўсёды і ва ўсім захоўваць мудрасць і дальнабачнасць.

У канцы трэба сказаць, што лейтматывам усіх атрыманых прывітальных тэлеграм з'яўляецца падтрымка адданасці Рэспублікі Беларусь прынцыпам дружбы народаў і аб'яднання намаганняў у барацьбе з сучаснымі выклікамі і глабальнымі пагрозамі і пажаданне стваральнай дзейнасці на карысць Беларусі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Наша кіно

# МЕТАФАРА ЦІ ГЕРАІЗМ У ЭКСТРЭМАЛЬНЫХ УМОВАХ

**У пятніцу 19 лютага на «Беларусь 3» убачым фільм «Міравы хлопец», які выйшаў на кінастудыі «Беларусьфільм» паўстагоддзя таму, у 1971 годзе.**

Кінастужка рэжысёра Юрыя Дубровіна расказвае пра маладога інжынера Віктара Логінава, які прыязджае ў адну з краін Усходу ў якасці тэхнічнага прадстаўніка Мінскага аўтазавода і там па збегу абставін трапляе на міжнароднае ралі замест аднаго з прафесійных гоншчыкаў. Сярод майстроў наш хлопец навічок і прадстаўнікі замежных фірмаў не зацікаўленыя ў тым, каб Віктар перамог. Але мужнасць і ўпэўненасць у сабе дапамагаюць інжынеру пераадолець усе перашкоды на сваім шляху, дзе небяспека сыходзіла як ад прыроды, так і ад людзей.



У ролі Віктара зняўся акцёр Мікалай Алялін (ён жа палкоўнік міліцыі ў «Джэнтльменах удачы»). Разам з ім у фільме зняліся Любоў Румянцава, Валянціна Спярантава, Мікалай Яроменка і іншыя. Асобныя натурныя здымкі кінастужкі праходзілі ў Афганістане. Усе прадстаўленыя ў «Міравым хлопцы» аўтамабільныя маркі акрамя МАЗ-516, на якім выступае ў фільме Логінаў, выдуманыя, але самі грузавікі сапраўдныя. Усе чатыры аўтамабілі былі ў свой час закуплены Мінскім аўтазаводам для вывучэння замежнага вопыту. Краіна Нуабарыя, у якой аказваецца малады хлопец у камандзіроўцы, таксама выдуманая. У фільме ўпершыню прагучала песня Веніяміна Баснера «Бярозавы сок» у выкананні «Песняроў».

«Міравы хлопец» — кінаработа, якая выклікае ў аўдыторыі розныя ацэнкі. І ў ім, нягледзячы на час, можна ўбачыць розныя акцэнты. Аднак, галоўнае — гэта тое, што калі мы маем веру ў сябе і ў тое, чым даражым, то перашкоды — толькі часовая з'ява. Глядзіце і рабіце ўласныя высновы.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 114

Аўтар сённяшняй задачы — Міхаіл Кошаль з Мінска (*гл. дыяграму*).




**Белыя:** Крс1, Фf1, Лb5, Ле6, Сf8, Сh1, Ка3, Кd3, пп. d2, d5, f5 (11).

**Чорныя:** Крd4, Лh4, Сb3, Ке4, пп. а4, с5, f6, g3, h2 (9).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Прааналізуем два эцюды, якія склаў беларускі шахматны кампазітар, кандыдат у майстры спорту Уладзімір Клюкін.

**№ 1.**

**Белыя:** Крg8, Са2, пп. с7, е4, f5 (5).

**Чорныя:** Кра8, Сс8, пп. а3, b2, е6, f6 (6).

Выйгрыш.

1. е5! ef 2. ef Крb7 3. f7 b1Ф 4. С:b1 Се6 5. с8Ф+! Кр:с8 6. С:f5.

№ 2.

Белыя: Кра5, Са2, Сh4 (3).

Чорныя: Крс8, Кh7, пп. с7, h3 (4).

Выйгрыш.

1. Се6+! Крb7 2. С:h3 Кf8 3. Сf5 Крс6 4. Се7 Кd7 5. Се4х

* * *

Чэмпіянаты Беларусі сярод юнакоў і дзяўчат да 18 гадоў выйгралі Максім Царук і Ксенія Норман. Падрабязнасці — у наступным выпуску.

У адным з анлайн-турніраў на сайце chess.com Сяргей Жыгалка заняў 18-е месца з 773 удзельнікаў, у другім — 17-е з 747. Дзяніс Лазавік у аналагічным турніры заняў 32-е месца з 811.

* * *

У галандскім Вэйк-ан-Зээ, пачынаючы з 1930-х гадоў, традыцыйна ладзяцца вельмі прэстыжныя ў шахматным свеце турніры. Сёлета такое спаборніцтва прайшло 83-і раз. Ва ўмовах пандэміі яно сабрала хоць і менш элітны, чым заўсёды, але таксама моцны склад удзельнікаў, сярод якіх быў і дзеючы чэмпіён свету Магнус Карлсен. Звычайна нарвежац займае ў турнірах першыя месцы ці, прынамсі, трапляе ў прызавую тройку. Але гэтым разам ён быў толькі шосты з 14 гульцоў. «Сапсаваў» жа вынік чэмпіёну свету малады расійскі гросмайстар Андрэй Есіпенка, які выйграў партыю ў Карлсена.

Прапануем дзве партыі са згаданага турніру.

Магнус Карлсен — Максім Ваш'е-Лаграў. 1. d4 Кf6 2. с4 g6 3. Кс3 d5 4. cd К:d5 5. е4 К:с3 6. bc Сg7 7. Фа4+ Фd7 8. Фа3 b6 9. Кf3 с5 10. Се3 0-0 11. Лd1 cd 12. cd Фd6 13. Ф:d6 ed 14. Лс1 Сb7 15. Сd3 Кс6 16. Крd2 Лас8 17. h4 Кb4 18. Сb1 Лсе8 19. а3 Кс6 20. Са2 Л:е4 21. Сd5 Ка5 22. С:е4 С:е4 23. Лс7 а6 24. h5 b5 25. h6 Сf6 26. Сg5 Сh8 27. Лh4 Сd5 28. Крс3 Кс4 29. Кd2 К:а3 30. Крb4 Кс4 31. К:с4 С:с4 32. Се7 Ле8 33. Лf4 f5 34. g4 Крf7 35. С:d6+ Кре6 36. Сс5 Сf6 37. gf+ gf 38. Лс6+ Крf7 39. Л:f5 Ле6 40. d5, 1:0.

Аляксандр Дончанка — Фабіяна Каруана. 1. d4 d5 2. с4 с6 3. Кf3 Кf6 4. е3 Сf5 5. Кс3 е6 6. Кh4 Се4 7. f3 Сg6 8. Сd2 Се7 9. К:g6 hg 10. Фс2 Кbd7 11. 0-0-0 а6 12. g4 dc 13. С:с4 b5 14. Се2 с5 15. d5 К:d5 16. К:d5 ed 17. f4 b4 18. е4 d4 19. е5 Кb6 20. е6 Фd5 21. ef+ Крf8 22. h4 Ф:а2 23. Ф:g6 b3 24. Се1 с4 25. Л:d4 Ка4 26. Фb1 Са3 27. Ф:а2 bа 28. Крс2 Лb8 29. Лd8+ Л:d8 30. bа с3 31. Сg3 Лd2+ 32. Крb3 Кс5+, 0:1.

* * *

Рашэнне задачы М. Храмцэвіча з мінулага выпуску: 1. Лd1!. Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч. Шэраг ранейшых задач рашыў Уладзімір Ізотаў.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Цікавінкі ад «Алесі»

## Не прапусціце лютаўскі нумар часопіса




### ЭКА: ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ НА ШЛЯХУ ДА ШЧАСЦЯ

Многія беларускія жанчыны з хваляваннем і надзеяй чакаюць прыняцця ўрадам дакумента, дзе будуць канкрэтызаваны ўмовы на бясплатную працэдуру экстракарпаральнага апладнення (ЭКА), што прадугледжана ва Указе «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян».

Сёння жанчын, якія плануюць мацярынства пасля 35 гадоў, становіцца ўсё больш. Ці можна іх папракаць, што найперш яны імкнуцца атрымаць сур'ёзную адукацыю, наладзіць кар'еру, а потым ужо ў іх планах — нараджэнне дзіцяці? Напэўна, варта ўлічваць розныя акалічнасці. Жанчыны імкнуцца сваёй працай стварыць матэрыяльную базу для забеспячэння догляду нованароджанага і для яго далейшага выхавання. А гэта, па сутнасці, клопат і пра будучыню дзіцяці, і пра яго здароўе, і пра састарэлых бацькоў, якім даецца магчымасць «пажыць у сваё задавальненне». Сёння хутчэй выключэнне, чым правіла, сітуацыя, калі бабулю ставяць перад фактам «вось табе ўнук!», і яна вымушана адкінуць убок уласныя жаданні і вырашаць праблемы маладой сям'і.




З якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца жанчынам на шляху да жаданага мацярынства? Як правільна клапаціцца пра сваё жаночае здароўе? Пра гэта чытачам «Алесі» расказала гінеколаг-рэпрадуктолаг з 23-гадовым стажам Алена Панкратава.

### НАВОШТА НА СУКЕНЦЫ КАРАЛАВЫ КОЛЕР?

«Мода як ежа — вы не павінны зацыклівацца на адной




страве», — казаў японскі мадэльер і дызайнер Кензо Такада. Ці атрымліваецца ў беларусаў «не зацыклівацца» на кітайскім шырспажыве? Сусветныя трэнды ці нацыянальныя традыцыі вызначаюць пошукі айчынных дызайнераў? Чаму ў гардэробе беларусаў абавязкова павінны быць рэчы жыццярадасных колераў? Чаго пазбаўлены ў жыцці тыя, хто ігнаруе моду?

Пра гэта мы пагутарылі з кандыдатам мастацтвазнаўства, дацэнтам кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Галінай Мяшковай.

### Б'Е — ЗНАЧЫЦЬ ЛЮБІЦЬ?

Каханне — гэта, безумоўна, вялікая сіла. Але разам з тым




і слабасць. А часам яна бывае хваробай. Псіхолаг і гештальт-тэрапеўт Алена Гурына падзялілася: «Здзіўляюць прызнанні ў тым, што мужчыны кідаюцца на жанчын з нажом, б'юць, здраджваюць, марнуюць сямейны бюджэт на наркатычныя рэчывы або гульню, а раніцай у соты раз клянуцца, што «такога больш не паўторыцца», і жанчыны зноў і зноў даруюць ім і працягваюць клапаціцца аб такіх партнёрах».

Чаму жыццё некаторых мужчын і жанчын засяроджваецца на партнёры? Якія людзі часцей за ўсё аказваюцца ў палоне пачуццяў, з якога не могуць вырвацца? У якой дапамозе яны маюць патрэбу? Пра гэта і многае іншае чытайце на старонках «Алесі».

### ВЫПІЦЬ САЛАДУХІ ПАД ПЕСНІ САЛАДУХІ

Народныя зімовыя напоі дапамогуць паправіць здароўе і палепшыць настрой. Прытым яны безалкагольныя! У халодны перыяд года, які на Беларусі цягнецца ад позняй восені да пачатку мая, самы час ужываць нарыхтаваныя ўлетку дзікарослыя плады і ягады, садавіну, а таксама лекавыя пахучыя расліны. На вёсцы з іх традыцыйна гатавалі розныя напоі: узвар, кісель, квас, морс, кулагу, саладуху і іншыя. Усе яны дапамагаюць падтрымаць імунітэт. Мы сабралі некалькі рэцэптаў напояў, якія і цяпер любяць гатаваць беларускія гаспадыні.



АКЦЭНТЫ

# КАБ ВЫКАРЫСТАЦЬ НАЙЛЕПШАЕ

## 17 лютага 1996 года была створана Пастаянная камісія ПА СНД па вывучэнні вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання

**Напэўна, сімвалічна, што сёлета, калі СНД спаўняецца 30 гадоў, у гэтай міждзяржаўнай рэгіянальнай арганізацыі старшынствуе Беларусь, якая стаяла каля вытокаў яе стварэння. Яшчэ адну прыгожую дату згадваюць гэтымі днямі прадстаўнікі краін — членаў Садружнасці, і наша краіна таксама мае да гэтага непасрэднае дачыненне — 25 гадоў таму была створана Пастаянная камісія Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД па вывучэнні вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання. Сёння гэту камісію ўзначальвае старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянцін СЕМЯНЯКА. Мы спыталі яго пра тое, што парламентарыям удалося зрабіць за чвэрць стагоддзя, і над чым яны працуюць цяпер.**

***— Валянцін Міхайлавіч, раскажыце гісторыю стварэння Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД па вывучэнні вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання.***

— Яна была ўтворана на чацвёртым годзе работы Асамблеі — 17 лютага 1996 года. Каля вытокаў стаяў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль Красуцкі, які потым узначальваў камісію да сакавіка 2001 года, браў непасрэдны ўдзел у пошуку асноўных напрамкаў яе дзейнасці, формаў узаемадзеяння і вывучэння вопыту краін Садружнасці.

Назва камісіі вызначае сферу яе інтарэсаў: вывучэнне вопыту дзяржаўнага будаўніцтва, пытанні рэгіянальнага дзяржаўнага кіравання, рэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва, эканоміка і фінансы рэгіёнаў, агульныя прынцыпы арганізацыі мясцовага самакіравання, пытанні абароны правоў грамадзян на ажыццяўленне мясцовага самакіравання, распрацоўка мадэльных заканадаўчых актаў па пытаннях правядзення выбараў і рэферэндумаў на дзяржаўным і мясцовым узроўні, супрацоўніцтва з міжнароднымі саюзамі, асацыяцыямі і іншымі аб'яднаннямі органаў мясцовага самакіравання.

Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць з гадавінай стварэння камісіі ўсіх парламентарыяў, якія ў розны час працавалі ў яе складзе і працягваюць плённую дзейнасць у цяперашні час, падзякаваць за асабісты ўклад у яе стварэнне і станаўленне дэпутатам, якія сталі каля яе вытокаў, і пажадаць плёну ў рабоце на карысць нашых народаў.

Ужо на першым яе пасяджэнні было прызнана неабходным прыступіць да распрацоўкі мадэльнага Закона аб агульных прынцыпах мясцовага самакіравання ў дзяржавах СНД, і ў канцы наступнага года такі закон быў прыняты (з 2015 года — у новай рэдакцыі). Яшчэ да ўхвалення закона з нацыянальным парламентаў паступіла інфармацыя аб выкарыстанні асобных палажэнняў яго праекта ў заканатворчым працэсе.

У 1998—1999 гадах Міжпарламенцкай Асамблеяй былі прынятыя мадэльныя законы «Аб мясцовым рэферэндуме», «Аб агульных прынцыпах арганізацыі мясцовых фінансаў», «Аб асновах дзяржаўнай службы» і рэкамендацыі «Аб асноўных гарантыях выбарчых правоў і агульных прынцыпах арганізацыі і правядзення выбараў і рэферэндумаў».

З таго часу вядзецца актыўная дзейнасць камісіі па падрыхтоўцы мадэльнай заканадаўчай базы ў сферы выбарчага права. Летась Міжпарламенцкай Асамблеяй прыняты мадэльны Выбарчы кодэкс для дзяржаў — удзельніц СНД, на 2021—2022 гады запланавана падрыхтоўка яшчэ трох дакументаў.

Акрамя таго, камісіяй падрыхтаваны Канвенцыя аб прыгранічным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД і Канвенцыя аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД (падпісаны на пасяджэннях Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у Бішкеку), а таксама шэраг мадэльных законаў.



***— У чым каштоўнасць стварэння мадэльных законаў у сферы дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання?***

— У абмене вопытам і магчымасці ўзяць нацыянальным парламентам найлепшае для сябе з напрацаванага і праверанага.

***— Якія найбольш важныя вынікі работы камісіі за 25 гадоў? Якім чынам камісія, у склад якой, акрамя беларусаў, уваходзяць прадстаўнікі яшчэ сямі краін, працуе над дакументамі?***

— Мы абменьваемся думкамі і прававымі дакументамі (у тым ліку на праектнай стадыі) па распрацаваных у парламентах праектах законаў, што адносяцца да пытанняў кампетэнцыі нашай камісіі.

На пасяджэннях прадстаўнікі аднаго з парламентаў, якія ўваходзяць у МПА СНД, распавядаюць аб практыцы ажыццяўлення мясцовага самакіравання ў сваёй краіне. Па выніках такіх выступленняў, якія выклікаюць жывую дыскусію, у часопісе «Веснік Міжпарламенцкай Асамблеі» рэгулярна публікуюцца матэрыялы.

Добрай традыцыяй для камісіі стала правядзенне выязных пасяджэнняў. Парламентарыі неаднаразова мелі магчымасць азнаёміцца з дзейнасцю профільных камітэтаў адміністрацый Санкт-Пецярбурга і Ленінградскай вобласці, наведвалі Заканадаўчы сход Ленінградскай вобласці. Абмяркоўвалі праблемы, звязаныя з фарміраваннем сістэмы органаў мясцовага самакіравання, дзяліліся існуючым тэарэтычным і практычным вопытам, атрыманым як у працэсе работы над законапраектамі, так і ў час правядзення дзяржаўна-прававых экспертыз, накіраваных на адпрацоўку нормаў і прынцыпаў мясцовага самакіравання.

Камісія ўдзельнічала ў арганізацыі і правядзенні канферэнцый, круглых сталоў і семінараў, якія адбыліся ў розных гарадах і краінах. Выязныя мерапрыемствы (Мінск, Калінінград, Ноўгарад, Душанбэ, Чалпон-Ата, Ольштын, Лапеенранта, Шлісельбург, Выбарг, Гатчына і інш.), якія праходзілі ў атмасферы ўзаемнага разумення і супрацоўніцтва, дазволілі азнаёміцца з вопытам арганізацыі мясцовага самакіравання, механізмамі рэалізацыі муніцыпальных праграм сацыяльна-культурнага развіцця, абмяняцца поглядамі на найбольш вострых праблемах.

> Назва камісіі вызначае сферу яе інтарэсаў: вывучэнне вопыту дзяржаўнага будаўніцтва, пытанні рэгіянальнага дзяржаўнага кіравання, рэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва, эканоміка і фінансы рэгіёнаў, агульныя прынцыпы арганізацыі мясцовага самакіравання, пытанні абароны правоў грамадзян на ажыццяўленне мясцовага самакіравання, распрацоўка мадэльных заканадаўчых актаў па пытаннях правядзення выбараў і рэферэндумаў на дзяржаўным і мясцовым узроўні, супрацоўніцтва з міжнароднымі саюзамі, асацыяцыямі і іншымі аб'яднаннямі органаў мясцовага самакіравання.

Статус афіцыйнага назіральніка пры камісіі мае Агульнарасійскі кангрэс муніцыпальных утварэнняў, які бярэ самы актыўны ўдзел у яе мерапрыемствах.

Даўняе сяброўства звязвае камісію з Саюзам расійскіх гарадоў — у пераліку сумесных спраў не толькі падрыхтоўка семінараў і канферэнцый, але і ўдзел у падрыхтоўцы праектаў мадэльных дакументаў.

***— Ці вывучаеце вы вопыт краін, якія не ўваходзяць у СНД?***

— Так, і вельмі ўважліва. Супрацоўніцтву з міжнароднымі саюзамі, асацыяцыямі і іншымі аб'яднаннямі органаў мясцовага самакіравання мы аддаём вялікую ўвагу.

Яшчэ ў 1998 годзе на пасяджэнні камісіі прысутнічала дэлегацыя Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Еўропы, якую ўзначаліў прэзідэнт Кангрэса Клод Эгі. У працэсе дыскусіі, якая адбылася на пасяджэнні камісіі, абодва бакі паказалі сваё імкненне да далейшага ўзаемавыгаднага і плённага супрацоўніцтва. Па выніках сустрэчы членамі дэлегацыі і прадстаўнікамі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД было падпісана камюніке.

У цэлым Пастаянная камісія Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД па вывучэнні вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання ў сваёй дзейнасці імкнецца максімальна грунтоўна вывучыць існуючыя ў краінах — удзельніцах СНД падыходы да заканадаўчай дзейнасці і ўлічыць яго, а таксама сусветны вопыт і навуковыя распрацоўкі пры праектаванні мадэльнага заканадаўства.

***— Якім чынам працягваецца работа камісіі ва ўмовах пандэміі?***

— Выкарыстоўваем дыстанцыйныя сродкі відэасувязі. Гэта не адбілася на якасці заканатворчай дзейнасці і вастрыні дыскусій. У планах камісіі — напружаная работа над гарманізацыяй заканадаўчай базы краін — удзельніц СНД з улікам асаблівасцяў нацыянальнага заканадаўства.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

# Навацыі для селекцыі

**У Жодзіне адбылося выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы сумесна з Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.**

Мэта паездкі — пошук аптымальнага заканадаўчага вырашэння праблем насенняводства сельскагаспадарчых раслін. З гэтай нагоды ў рамках падрыхтоўкі да разгляду ў другім чытанні праекта закона «Аб селекцыі і насенняводстве сельскагаспадарчых раслін» было вырашана з удзелам навукоўцаў і практыкаў правесці абмеркаванне верагодных змяненняў і карэкціровак у дадзены дакумент. Ці, інакш кажучы, зверыць пазіцыі.

Месцам правядзення сумеснай заканатворчай работы дэпутаты і сенатары абралі Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве невыпадкова. Гэта адна з вядучых навукова-даследчых устаноў аграрнай галіны краіны. Супрацоўнікі Цэнтра ўносяць значны ўклад у забеспячэнне харчовай бяспекі Беларусі, пастаянна ўдасканальваюць кірункі даследаванняў у земляробстве, селекцыі і насенняводстве.

У Жодзіне сваімі ідэямі і прапановамі па рэалізацыі дадзенага праекта, думкамі наконт яго ўдасканалення, у прыватнасці, па падрыхтоўцы пакета нарматыўных прававых актаў па забеспячэнні рэалізацыі закона аб селекцыі і насенняводстве, падзяліліся старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Мікалай Шаўчук, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы, генеральны дырэктар Цэнтра, доктар навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі Фёдар Прывалаў, іншыя вядомыя навукоўцы і практыкі-аграрнікі.

Удзельнікі пасяджэння ў другой палове дня наведалі і пазнаёміліся з работай селекцыйна-насенняводчага комплексу, дзейнасцю РУП «Шыпяны-АСК» — шматгаліновай гаспадаркі са спецыялізацыяй на вытворчасці мяса і малака, бульбы, кукурузы на зерне, рапсу, пшаніцы, жыта, півапарнага ячменю, трыцікале, проса і грэчкі.

У «Шыпяны-АСК» дзейнічае ўнікальны завод па сушцы, ачыстцы і дапрацоўцы элітнага насення.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# СВАЕ І ЧУЖЫЯ

## Магілёўскі сенатар Алег Дзячэнка заклікае выправіць гістарычную несправядлівасць і абараніць імёны загінулых на тэрыторыі еўрапейскіх краін чырвонаармейцаў

**Мы вельмі паважліва ставімся да памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны і працягваем шукаць «сляды» зніклых без вестак на спецыялізаваных сайтах і падчас палявых пошукавых экспедыцый. Але што рабіць з тымі, хто застаўся ляжаць на тэрыторыі краін, дзе іх подзвіг падвяргаецца сумненню? Тэма гэтая, на жаль, адкрытая. І магілёўскі сенатар Алег ДЗЯЧЭНКА, намеснік рэктара Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, адзін з нямногіх, хто ёй займаецца. Сёння ён расказвае, наколькі важна абараніць нашы воінскія пахаванні на тэрыторыі краін Усходняй Еўропы.**



Беластоцкая вобласць.

## Загінулі за Беларусь, а апынуліся ў Польшчы

Па іроніі лёсу пасля вайны Беластоцкая вобласць, якая раней уваходзіла ў склад БССР, была перададзена Польшчы. Атрымалася, што нашы салдаты і камандзіры загінулі за Беларусь, а цяпер ляжаць на польскай тэрыторыі. У іх ліку байцы 1291-га стралковага палка 110-й Верхнеднепроўскай стралковай дывізіі, якая ў ліпені 1944 года папаўнялася ў асноўным выхадцамі з Беларусі, у тым ліку з Магілёўшчыны. Гэта былі былыя партызаны і моладзь прызыўнога ўзросту.

— На жаль, гэтыя героі сёння літаральна забытыя, — перажывае Алег Дзячэнка. — А гаварыць пра гэта трэба, тым больш што сёння ў Еўропе набіраюць моц вельмі правыя неанацыяналістычныя арганізацыі і партыі, мэта якіх у літаральным сэнсе слова сцерці з сусветнай памяці подзвіг нашых салдат і камандзіраў, тых, хто цаной свайго жыцця вызваляў ад фашызму краіны Балтыі, Польшчу і Украіну.

Гэтай тэмай Алег Дзячэнка пачаў займацца гады два таму, пасля таго як да яго на адным з прыёмаў грамадзян звярнуліся родныя стрыечных братоў з вёскі Куты Магілёўскага раёна Пятра Мысава і Еўдакіма Лянькова.

26-гадовы Еўдакім загінуў у баі за хутар Радагошч у Навагрудскім раёне Беластоцкай вобласці ў апошні дзень аперацыі «Баграціён» — 29 жніўня 1944 года. Сёння хутара няма, а месца пахавання байца невядомае. Гвардыі лейтэнанта Пятра Мысава не стала 4 кастрычніка 1947 года. Пасля заканчэння вайны ў заходніх абласцях Украіны нацыяналістычныя бандфарміраванні больш за 10 гадоў вялі баявыя дзеянні супраць Савецкай улады, праваахоўнікаў і чырвонаармейцаў. Мысаў стаў ахвярай «АУНаўцаў» — членаў арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў. Месца яго першапачатковага пахавання знаходзілася ў горадзе Золачаў Львоўскай вобласці, але ці захавалася яно да сёння, невядома. Алег Дзячэнка па адукацыі — гісторык, і яму гэтая тэма аказалася вельмі блізкая. Па просьбе родных Пятра Мысава ён накіраваў зварот ва Украіну, каб высветліць, што там з пахаваннем камандзіра Чырвонай Арміі, але прайшло ўжо некалькі месяцаў, а адказу ўсё няма.


Спіс пахаваных каля хутара Радагошчына.


Еўдакім ЛЯНЬКОЎ.


Пётр МЫСАЎ.

## Страчаныя імёны

На сайце «Памяць народа» ёсць грунтоўная інфармацыя пра 110-ю стралковую дывізію. Гісторык звярнуў увагу, што ў яе ўваходзілі жыхары Чавускага, Магілёўскага, Клімавіцкага, Бялыніцкага і іншых раёнаў Магілёўшчыны. І шмат хто з іх загінуў на тэрыторыі Беластоцкай вобласці.

— Гэтыя людзі аддалі свае жыцці за нашу незалежнасць, а мы пра іх практычна не згадваем, — абураецца Алег Дзячэнка. — І нават не кажам пра іх на Дзень Незалежнасці. Забыліся, што ў 1944 годзе Беларусь была іншая.

Савецкі ваенны мемарыял у польскім горадзе Астраленка — адзін з найбуйнейшых. Па афіцыйных даных, там пахавана 10 625 байцоў Чырвонай Арміі, з іх вядомыя імёны крыху больш чым 2,2 тысячы.

— Большая частка цел байцоў 110-й стралковай дывізіі была перапахавана менавіта на гэтым мемарыяле, — кажа Алег Дзячэнка. — Узбуйненне могілак адбывалася пасля вайны паўсюдна, бо было шмат адзіночных пахаванняў. Але кагосьці пераносілі, а хтосьці так і застаўся ляжаць на тым месцы, дзе загінуў. А ў выпадку з Беластоцкай вобласцю яны яшчэ і адышлі іншай дзяржаве. Калі праект «Памяць народа» стаў прабіваць гэтую інфармацыю, высветлілася, што захаваліся журналы баявых дзеянняў і кнігі першапачатковых пахаванняў. Я ўзяў за прыклад адзін хутар, які ў 1944-м быў на пагранічны Беларусі і Польшчы, — Радагошч. Там загінула 28 чырвонаармейцаў, з якіх больш чым палова — ураджэнцы Магілёўшчыны. Калі параўнаў звесткі з інфармацыяй польскай кнігі перапахаванняў, даведаўся, што з 28 перапахавана ўсяго 10. І гэта толькі адзін прыклад. Невядомыя салдаты пры перапахаванні не ўлічваліся. А з імёнамі былі ў асноўным толькі тыя, каго пераносілі са шпітальных могілак, там быў строгі ўлік. Тыя ж байцы, якія гінулі каля вёсак і хутароў, практычна абязлічаны. Смяротных медальёнаў на той час ужо не было. Іх замянілі чырвонаармейскімі кніжкамі. Бой прайшоў, кніжкі забралі, салдат пахавалі, схемы склалі і ўсе справы. Адзін спіс павінен быў ісці ў штаб, другі — застацца ў мясцовых улад. Але хто тады за гэтым сачыў? Да таго ж, калі пачаліся перапахаванні, прайшло некальκі гадоў і некаторыя магілы зніклі. Бо забітых хавалі ў асноўным без трун. Не дзіўна, што іх астанкі так і не знайшлі.



| L.P. | Nazwisko i imię, imię ojca | Data urodz. i ilość żołn. | Data śmierci | Nr mogiły |
|---|---|---|---|---|
| | nieznanych z Carzezonowo | 6 | - | 91 |
| | nieznanych z [illegible] | 1 | - | 91 |
| | nieznanych z Nowej Wsi | 30 | - | 68 |
| | nieznanych z Troszyn | 14 | - | 68 |
| | nieznanych z Demięckiego | 6 | - | 69 |
| | nieznanych z [illegible] | 4 | - | [illegible] |
| | nieznanych z Radgoszcz | 10 | - | 69 |
| | nieznanych z [illegible] | [illegible] | - | 69 |
| | nieznanych z Zamości | 22 | - | 135 |
| | nieznanych - " - | 2 | - | 69 |
| | nieznanych z Janoch | 5 | - | 69 |
| | nieznanych z Grucel | 40 | - | 135 |
| | nieznanych z Łątczyn | 3 | - | 189 |
| | nieznanych z Dąbk | 57 | - | 189 |
| | nieznanych z Siemiątkow | 1 | - | 190 |
| | nieznanych z Zbiel | 21 | - | 135 |
| | nieznanych z [illegible] | 3 | - | 190 |
| | nieznanych z Wojen | 19 | - | 190 |
| | nieznanych z Dobonin | 17 | - | 190 |

Перапахавана з Радагошча дзесяць чалавек.

## Яны абаранілі нас, цяпер трэба абараніць іх

На фоне тых антысавецкіх настрояў, якія пануюць на тэрыторыі Польшчы, краін Балтыі, Украіны, захаванне памяці савецкіх салдат становіцца ўсё больш актуальнай справай. Як гэта зрабіць? Сенатар лічыць, што меры трэба прымаць на самым высокім дзяржаўным узроўні. Актывізаваць адмысловую работу па лініі Міністэрства замежных спраў, а яшчэ лепш прыняць адпаведную праграму. Праблема відавочная, яе трэба неадкладна вырашаць.

— На тэрыторыі Беларусі пошукавікі працуюць, а да тых байцоў, якія ляжаць у зямлі ў Польшчы, нікому няма справы, — непакоіцца сенатар. — Сёння, калі абвастрылася палітычная сітуацыя і савецкія воінскія пахаванні падвяргаюцца нападам з боку вандалаў або ціха ліквідуюцца пад соусам так званага савецкага акупацыйнага рэжыму, нельга маўчаць. Трэба заступіцца за беларусаў, якія загінулі за вызваленне сваёй краіны, і не іх віна, што яны апынуліся на тэрыторыі Польшчы. Гэта вельмі трагічная для беларусаў старонка. Дастаткова ўспомніць жорсткую разню ў студзені-лютым 1946 года, калі польскія нацыяналісты здзяйснялі акты знішчэння карэннага беларускага насельніцтва на гэтай тэрыторыі і выразалі беларусаў сем'ямі. Беларусь — адзіная краіна, якая ў выніку вайны панесла не толькі вялікія фізічныя, але і тэрытарыяльныя страты. І гэта таксама вельмі важная тэма. У Год народнага адзінства было б добра зацвердзіць яшчэ і звязаную з такім пасылам дату. За аснову можна ўзяць 17 верасня, дзень, калі ў 1939 годзе пачалося аб'яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі. Гэта дата якраз упісваецца ў тэму захавання памяці нашых салдат. Яна магла б стаць падставай для аднаўлення іх памяці. І гэта абавязкова трэба зрабіць. Яны чакаюць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Алега ДЗЯЧЭНКІ:**
**Спіс імёнаў з партала «Памяць народа».**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 18 лютага 2021 года.




# «У жонак саперніц не бывае»

Даўно гэта было, а помніцца — нібы ўчора.

...У свае студэнцкія гады я вельмі любіла прыязджаць у Кіеў. Там, у гэтым цудоўным горадзе, жыў родны брат майго таты. Можа, таму што сам тата загінуў на фронце, можа, таму што сваіх дзяцей у дзядзькі не было, мае прыезды заўсёды шчыра віталіся. Разам з радняй мы гулялі па горадзе, хадзілі ў тэатры, музеі, паркі, знаёміліся з людзьмі.

У дзядзькі, напрыклад, быў закадычны сябра Сцяпан. Яны часта сустракаліся, разам адзначалі святы, за сталом вельмі хораша спявалі, а ў «працэсе», добра падвыпіўшы, дзядзька Сцяпан нязменна прызнаваўся жонцы ў каханні: казаў, які ж гэта цуд, што яны сустрэліся, і як жа яму пашчасціла!

Гэтыя маналогі заўжды былі доўгія, палымяныя, прыгожыя словы «перасыпаліся» ўспамінамі, з якіх няцяжка было зразумець, што яны з цёткай Верай хірургі, што за вайну зрабілі безліч аперацый, прычым, здаралася, пад бамбёжкамі, што прыцярпеліся нават да таго, што «пад нажом» нехта паміраў, што ніколі не высыпаліся, што жонка — быў такі грэх — рыдала ў яго на плячы і казала, што ўсё, болей не можа, што лягчэй памерці, чым вытрымаць... А ён тады, як мог, суцяшаў, казаў, што такая ў іх работа — людзей ратаваць, жыць і трымаць сябе ў руках — пры любых абставінах.

Потым, калі скончыўся кашмар вайны, яны вярнуліся ў Кіеў, жылі спачатку ў зямлянцы, трохі пазней атрымалі кватэру, у іх нарадзіўся сынок.

...У той прыезд да сваяка мяне разбудзілі мужчынскія галасы: дзядзька Сцяпан, як я зразумела, прасіў майго дзядзьку, каб той пазычыў яму грошай на... тэлевізар. Але ж ён — я дакладна ведала — у іх з цёткай Верай быў... «Можа, згарэў?» — падумала. І ўсё роўна не магла ўцяміць, як гэта ў двух хірургаў бракуе грошай? На машыну, — яшчэ зразумела б...

За снеданнем я стала распытваць радню і пачула, што неяк, вярнуўшыся з работы, цётка Вера не ўбачыла дома ні мужа, ні дываноў на сценах і падлозе, ні тэлевізара... Суседзі падказалі, што бачылі машыну, у якую Сцяпан усё гэта згружаў, а нейкая маладзіца яшчэ і падганяла... Трэба разумець, звяла чалавека.

Аднак сыну пра гэта Вера не сказала: тата ў камандзіроўцы, маўляў, хутка вернецца, прычым з падарункамі...

Яна тады ж абышла суседзяў: напрамілы бог прасіла, каб малому — ні слова. «А сама ж ты як будзеш?» — пыталі ў Веры спагадлівыя жанчыны. «Ды па правілах ваеннага часу — жыць трэба пры любых абставінах».

І зажыла...

А праз нейкі час позна ўвечары ў іх кватэру нехта пазваніў. Гаспадыня адчыніла дзверы: за парогам стаяў Сцяпан.

— Я дамоў прыйшоў. Пусціш? — спытаў у жонкі.

Тая соладка пазяхнула, бо паранейшаму ніколі не высыпалася, і адказала:

— Суп на пліце. Пагрэй сам.

На гэтым, яшчэ раз пазяхнуўшы, пайшла ў спальню.

...Сцяпан потым казаў сябру, што ад сустрэчы з жонкай чакаў чаго заўгодна, — толькі не вось гэтага!

І пазней спрабаваў прасіць прабачэння. Толькі Вера, зноў жа, слухаць не стала. Сказала: «Помніш, на фронце мы так чакалі міру, нармальнага жыцця, сына... У нас ён ёсць. Значыць, будзем гадаваць. Ты толькі помні, што ў сапраўдных жонак саперніц не бывае».

**Зоя Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

# «Во-о-ось дзе шчасце рыбака!»

*...Нібы церам наша хата:*
*Чыстата...*
*Аж зіхаціць,*
*Заўтра — гадавое свята:*
*У Тройцу грэх не адпачыць!*

*...Брат не схільны*
*ў нас лайдачыць:*
*— Можаш крышку падсабіць?*
*Шчупака ў канаве бачыў,*
*Мне самому — не зладзіць...*

*Як мага разводзіць рукі:*
*— Вось такенны там шчупак!*
*Кош бяры, без гэтай штукі*
*Нам не выцягнуць ніяк.*

*Я ж тады — яшчэ малая,*
*Вёснаў шэсць было ці пяць,*
*Танканогая, худая,*
*А рыбалку — не праспаць:*

*Не было мілейшай справы...*
*(І ў ваколіцах — ракі:*
*За гародам, у канаве,*
*Ў нас «хадзілі» шчупакі).*

*Часта ладзячы аблавы,*
*Мы ўжо зналі, што рабіць:*
*Мне — ваду*
*аж да заставы*
*Ў нашым рове замуціць.*

*А у ёй — гіблота п'явак,*
*Жук ды жаба рэй вядуць,*
*А шчупак?.. А цьма казявак?..*
*Яны ж пяты адгрызуць!*

*І нікому ні паўслова,*
*Што ад страху ўсё дрыжыць.*
*Я ваду «ўзбіваць» гатова,*
*Брат —*
*канаву замасціць.*

*Паміж намі —*
*метраў з дзесяць,*
*Ён насустрач мне ідзе,*
*Мы па дне нагамі месім —*
*Гонім рыбіну ў вадзе.*

*Зараз, зараз будзе цуда!*
*Я на месцы тупачу*
*Ля чарговае запруды*
*Страшна так, што верашчу!*

*Брат камандуе:*
*— На выхад!*
*Мігам!.. Куляю сюды:*
*Шчупаку няма чым дыхаць —*
*Зяпа сунецца з вады!*

*...Во-о-ось той момант*
*на рыбалцы!*
*Во-о-ось дзе шчасце рыбака!*
*Моцна кош сціскаюць пальцы,*
*Каб «падрэзаць» шчупака.*

*Ён жа —*
*выскачыць ірвецца*
*І звіваецца вужом!..*
*Так ад шчасця сэрца б'ецца,*
*Што й не страшна мне ўжо.*

*Дзе там п'яўкі ды казяўкі?!*
*З братам ловім уюноў...*
*І вясёлыя, з рыбалкі*
*Мы вяртаемся дамоў.*

**Валянціна Козыр,**
*г. Мінск.*

# За што купіў...

Гэтая гісторыя адбылася даўно, тады, калі старшыні калгасаў яшчэ размаўлялі па-беларуску.

Значыць, адзін з іх, Анатоль Пятровіч, правёў ранішнюю нараду са спецыялістамі, размеркаваў людзей і тэхніку, усіх «распусціў», папрасіў застацца хіба новага агранома (ён з тыдзень як прыехаў). Папытаўся:

— Як з жыллём? Уладкаваўся?

— Дзякуй. Усё нармальна, — сказаў той і ўжо хацеў сысці, як пачуў новае пытанне:

— А што на сёння плануеш? Калі нічога пільнага, можа, аб'ездзем вытворчыя ўчасткі? Паглядзім на палі, разам прыкінем, што дзе пасеяць...

— Згода, Анатоль Пятровіч. Я толькі на склад зазірну (там распарадзіцца трэба) і адразу назад.

— Ну тады чакаю каля машыны і едзем.

...Трэба сказаць, што паездзіць з гэтым старшынёй для многіх было за шчасце, бо гаспадаркай ён кіраваў з розумам, добра ведаў і людзей, і зямлі свае, ніколі не жульнічаў (іншым таксама не дазваляў), любіў некаму дапамагчы ды нешта параіць, мог пажартаваць...

Вось і з новым аграномам яны добра папрацавалі, шмат што вырашылі.

— Усё запомніў? — спытаў Анатоль Пятровіч у агранома. — А то, можа, запісаў бы, каб чаго не забыцца, не вытрасці з галавы, бо на трэці ўчастак мы напрасткі паедзем. Дарога там — яма на яміне, але ж кіламетры з тры зрэжам: за вёскай выскачым на шашу...

А тым часам вось яна, тая самая вёска, вось і той шлях.

— Як справа? — пытае ў агранома Анатоль Пятровіч.

— Нармальна, — адказвае аграном.

Машына толькі на дарогу і...

Тут жа, рэзка, улева, бо справа на ўсіх парах на іх імчаў грузавік: яны цудам не сутыкнуліся!

— Ты ж казаў, што *справа* ўсё нармальна, што перашкод няма?! — ледзь спыніўшы машыну, стаў сварыцца старшыня.

— А я не зразумеў: думаў, вы пра *справы* на ўчастку... Дык я ўчора з яго начальнікам гаварыў. Той сказаў, што ўсё нармальна.

...«За што купіў, за тое прадаю» — праўдзівая прымаўка, але ж у тым выпадку, калі бакі ведаюць, *што* яны прадаюць і *што* купляюць.

**Мікалай Багданаў,**
*Мёрскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## Неасабісты суб'ектыў



# АМІЛЬЧЫНА ФІЛАСОФІЯ

## Якое выхаванне сёння было б не лішняе

ПРАЗ мяцеліцу, якая апанавала плошчу так, што і Дом урада, і «слупок» педуніверсітэта ледзь угадваліся па абрысах, я дайшла нарэшце да Чырвонага касцёла. Пацягнула на сябе цяжкія каваныя дзверы, перавязаныя чыймсьці цёплым шалікам, каб не грукалі, зачыняючыся, купіла свечку, паставіла яе каля распяцця справа ад алтара — за спачын. Бабка была б задаволеная. Уявіла, як яна ўсміхаецца, — прыгожая нават у сваёй глыбокай старасці, з крамянымі ружовымі шчочкамі, акуратнымі вуснамі, празрыста-блакітнымі, амаль дзіцячымі вачыма, прыбраная ў балонневую маладзёжную куртку, якую я насіла ў дзясятым класе. Яна мне такой заўжды, нават праз дваццаць пяць гадоў пасля смерці, і ўяўляецца — сядзіць на калодцы каля брамкі, уся такая маленькая, рухавая, як птушачка, у ярка-ружовай куртцы, з цікавасцю пазірае на вуліцу: хто ідзе, што нясе, як апрануты. Кожны год у лютым я, праваслаўная, іду ў касцёл, каб памаліцца за спачын душы Эміліі. Нашай Амількі, якой, як зразумела, стаўшы зусім дарослай, абавязана не толькі тым, што яна ў дзяцінстве замяніла мне дзіцячы садок, якога не было ў прынцыпе. Не толькі гэтым — нашмат, нашмат большым.

ЯНА была простай сялянскай жанчынай, не чытала разумных кніжак па псіхалогіі і выхаванні (яна ўвогуле не чытала кніг — не было калі, дый жыццё само было мудрэйшае за любы літаратурны сюжэт). Часам, як па сённяшніх уяўленнях, зусім непедагагічна сварылася за якую шкоду, здаралася, і перацягвала дубцом ці анучай па мяккім месцы. Але ж — выхоўвала. Уласнай выпакутаванай простай жыццёвай філасофіяй, у якой не было месца жалю, але заўсёды знаходзілася шкадаванне (толькі з гадамі разумееш, якая вялізная розніца паміж гэтымі паняццямі), у якой была рэалістычная разважлівасць, якая межавала з цынічнасцю, у якой было спакойнае, без прыніжэння і фанабэрыстасці, пачуццё ўласнай годнасці.

Вучыла, як магла — словамі, уласнымі ўчынкамі. Прычым на звычайных побытавых сітуацыях, але ж яно неяк клалася на розум, на сэрца, складвалася ў характар, запісвалася ў асабісты маральны кодэкс. Памятаю, як мама, дастаючы з халадзільніка двухлітровы слоік смятаны, упусціла яго з рук. Не памятаю, ад чаго — ад спалоху ці ад таго, што шкада было той смятаны, я, пяцігадовая, зараўла на ўсю хату. Мама, і без таго злосная, пасля дарэмных спроб супакоіць румзанне, дала мне плескача па «пятай кропцы» («Каб ведала, чаго плачаш».) Якраз вярнуўся з работы бацька, убачыў злосную жонку, разлітую смятану і сваю любіміцу, якая раўла ўжо на ўсю моц. Падумаў, канешне, што шкоду ўчыніла я, за што і пакараная, і пачаў сварыцца на маму. Ваша пакорная слуга зараўла яшчэ мацней. Карацей, вэрхал і скандал. Які бабка Амілька супыніла некалькімі словамі. Проста, не спрабуючы супакоіць, сказала малой: «Ад таго, што ты плачаш, смятана назад у слоік не збярэцца»... Я ўспамінала гэты выпадак праз шмат гадоў, калі чытала ў Францыска Асізскага: «... дай мне пакорлівасць прыняць тое, што я не магу змяніць...», у Рэмарка: «Вельмі мала што ў жыцці бывае доўга важным»... Мільгала тады ў галаве: я даўно ўжо пра гэта ведаю, гэтым кіруюся. Адкуль? Бабка, мая маленькая вясковая бабка расказала мне пра гэта.

А яшчэ бабуля мне з маленства паказвала... смерць. Яна брала мяне на ўсе пахаванні, якія ў даволі вялікай і шматлюднай па тым часе вёсцы здараліся даволі часта. (Шок для сучасных бацькоў і дзіцячых псіхолагаў.) Толькі праз гады я зразумела, чаму ў вясковай традыцыі гэта было справай звычайнай і (кіньце ў мяне камень) важным элементам выхавання. Менавіта так, проста, без пакутных, правільна падабраных слоў у малога з'яўлялася разуменне крохкасці жыцця, неабходнасці берагчы сябе і блізкіх. Бо вось жа хадзіў чалавек па вясковай вуліцы, вітаўся, жартаваў, а цяпер ляжыць нерухомы, зусім на сябе не падобны, і яго закапаюць у зямлю, і больш яго не будзе. Тое, чаго аніяк не паправіш. І з'яўлялася тады адваротнае разуменне: усё астатняе, акрамя гэтага, паправіць можна. Адзіная безвыходная сітуацыя — смерць. Калі я чытала гэта ў Караткевічавых «Каласах...», я ўжо ведала. Дзякуючы бабцы я сама дайшла да гэтага яшчэ ў дзяцінстве.

Яна ніколі не мітусілася і не прыгаворвала, калі здаралася якая няўзначная дзіцячая траўма. Разбітае калена або парэзаны палец увогуле такімі не лічыліся. «Прыкладзі трыпутнік і перастань раўці, нічога страшнага», — гэтыя яе спакойныя словы вельмі хутка высушвалі слёзы. Нашмат складаней было з крыўдамі, пакуль аднойчы, здаецца, у другім класе, не дайшло тое, што бабка мне паўтарала неадночы: «Дурная, чаго плачаш? Многа ім гонару, што ты плачаш!» І працягам гэтага правіла стала яшчэ адно, якое прачытала пазней у Булгакава, пра тое, што не варта нічога ні ў кога прасіць, — я, дзякуючы бабулі, кіравалася ім яшчэ задоўга да таго, як упершыню разгарнула гісторыю пра Воланда і Пілата.

А яшчэ яна вучыла мове — жывой, не з кніжак. І гэта таксама — назаўсёды. Ідзеш вечарам з работы стомленая, снег лёгкі з неба пацярушвае. І раптам сама сабе думаеш бабчынымі словамі: «Сняжок тынькае». І ад гэтага «тынькае», якое толькі дома пачуеш, так спакойна і хораша становіцца, як у маленстве, калі ўсе блізкія былі жывыя, былі побач. І разумееш, што яны нікуды не зніклі, што яны па-ранейшаму з табой, як і гэтае бабуліна, не запісанае ў слоўніках роднае слова...

Яна і сёння дапамагае мне жыць. Калі раптам прыходзіць роспач з-за праблем на рабоце, у побыце, у асабістым, — я ўяўляю, як бабка Аміля, здзекліва прыжмурыўшыся, пытае: «І гэта, па-твойму, праблемы?» «Не, канешне», — адказваю я сабе і ёй, якая ў 37-м засталася ўдавой з двума дзецьмі і ярлыком жонкі «ворага народа», якая перажыла жудасць вайны, якая працавала ў калгасе за «палачкі», якая ў восемдзесят пахавала пяцідзесяцігадовага сына. І сапраўды — якія ў мяне праблемы?..

ТАКІХ бабуль на нашай зямлі ўжо няма. Сышло іхняе пакаленне... Пазіраюць на нас зверху, пытаюць з'едліва: «І гэта ў вас праблемы?» А мы і нашы дзеці, многіх з якіх хтосьці крыўдна, але трапна назваў «інфантыльнымі летуценнікамі-недарэкамі», не знаходзім у сабе ні смеласці, ні мудрасці адказаць ім тое, што яны былі б шчаслівыя ад нас пачуць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# «ЧОРНЫ КОРПУС» або Беларускі

**...У пачатку жніўня 1941 года ў Барысаве назіралася вялікая колькасць бранятэхнікі і ўзброеных атрадаў фашыстаў. Меры бяспекі прыняты беспрэцэдэнтныя: у горадзе ўведзены каменданцкі час і забарона для насельніцтва пакідаць свае дамы нават удзень. Па ўсім было відаць, што чакалі кагосьці вельмі важнага. Але каго?**

## План «Барбароса» на мяжы зрыву

У Старабарысаўскай сядзібе князёў Радзівілаў, якая знаходзілася недалёка ад Барысава, летам 1941 года размяшчаўся штаб групы армій «Цэнтр», дзе праходзілі ўсе асноўныя нарады нямецкага кіраўніцтва, але такую колькасць аховы тут бачылі ўпершыню. Інтрыга закончылася 4 жніўня 1941 года, калі на пляцоўцы паблізу Барысава прызямліўся самалёт Гітлера. Гэта было першае наведванне фюрарам акупаванай тэрыторыі СССР. Факт сам па сабе надзвычайны. Што ж прымусіла вялікага правадыра «непераможнай арміі» пакінуць свае справы і тэрмінова прыбыць на тэатр ваенных дзеянняў? І прыбыць менавіта ў Беларусію?

**Пасля гібелі савецкага генерала немцы пахавалі яго з усімі воінскімі ўшанаваннямі. Менавіта гэты факт адыграў фатальную ролю ў ацэнцы дзейнасці 63-га стралковага корпуса і асабіста яго камандзіра.**

У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМАРФ) захоўваецца звыш 20 тысяч спраў, якія маюць дачыненне да групы армій «Цэнтр», што дзейнічала на тэрыторыі Беларусі, а таксама нядаўна рассакрэчаныя дакументы, якія датычацца першых тыдняў, месяцаў ваенных дзеянняў нямецкай арміі на тэрыторыі краіны. Насуперак існуючаму пункту гледжання, што Чырвоная Армія была цалкам дэмаралізавана, яны сведчаць, што фашыстам тут было далёка не салодка і для іх усё пайшло не так. Савецкія войскі хоць і адступалі, але аказвалі адчайнае супраціўленне. Пра гэта можна прачытаць у лістах нямецкіх салдат дадому, напрыклад Сімон Баўмер пісаў: «...рускія аказваюць вельмі моцнае супраціўленне... У гэтым паходзе многія шкадуюць, што Расія — не Польшча і не Францыя, і няма ворага больш моцнага, чым рускія». Або з ліста унтэр-афіцэра Р. Фуша да бацькоў: «Я цяпер вельмі адзінокі, бо з майго аддзялення нікога больш не засталося ў жывых». На фронце, нягледзячы на імклівае прасоўванне, для немцаў справы было нямала драматычных момантаў. У раёне Налібоцкай пушчы з 28 чэрвеня да 4 ліпеня 1941 года, дзе часці Чырвонай Арміі скоўвалі 25 дывізій нямецкай групы армій «Цэнтр», утварыўся Навагрудскі кацёл. З 6 да 10 ліпеня ў раёне Лепеля, Сянно і Багушэўска адбылася адна з найбуйнейшых бітваў перыяду вайны, у якой узяло ўдзел больш за тысячу танкаў. У выніку контрнаступлення савецкія войскі прасунуліся на захад на 50 км. Але, мабыць, самым непрыемным стала паведамленне аб вызваленні рускімі ў сярэдзіне ліпеня двух беларускіх гарадоў — Рагачова і Жлобіна 63-м стралковым корпусам пад камандаваннем нейкага генерала Пятроўскага. Неверагодна, але ён змог перайграць найлепшых нямецкіх военачальнікаў! Гэта стала поўнай нечаканасцю для немцаў і асабіста для Гітлера. А для савецкіх людзей праменем надзеі стала вячэрняе паведамленне Саўінфармбюро ад 16 ліпеня 1941 года: «На Заходнім напрамку нашы войскі зноў завалодалі гарадамі Жлобін і Рагачоў. На астатніх участках фронту



Генерал-лейтэнант Леанід Пятроўскі.

ідуць упартыя баі з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка».

Гітлер нерваваўся. Знаходзячыся ва Усходняй Прусіі, у прыгарадзе Растэнбурга (цяпер — польскі горад Кентшын), дзе ў Гёрліцкім лесе з 26 чэрвеня 1941 года, практычна з самага пачатку ўварвання на тэрыторыю СССР, у наземным каменным бункеры размяшчалася яго стаўка пад назвай «Ваўчынае логава», ён адну за адной выдае свае дырэктывы. Яны трывожныя і зусім не змяшчаюць бравады краіны-пераможніцы. Хутчэй наадварот. Фонд 500 ЦАМАРФ, вопіс 12454 змяшчае дакументы «Групы армій «Б»/«Цэнтр». У іх Дырэктыва Вярхоўнага камандавання Вермахта № 33 ад 19 ліпеня. Наступная — 23 ліпеня, дадатак да дырэктывы ВКВ № 33. 30 ліпеня, Дырэктыва ВКВ № 34. У ёй групе армій «Цэнтр» загадана прыпыніць наступленне: «Ва ўмовах, калі праціўнік, не лічачыся са стратамі, аказвае ўпартае супраціўленне, неабходна адмовіцца ад правядзення аперацый з далёка ідучымі мэтамі да таго часу, пакуль праціўнік яшчэ валодае рэзервамі для нанясення контрудараў». А 27 ліпеня 1941 года ў штаб-кватэры камандуючага групай армій «Цэнтр» прайшла экстранная нарада. На ёй у дапаўненне да дырэктыў Гітлера былі зачытаны загад фельдмаршала фон Браўхіча з патрабаваннем прыпыніць наступленне на Маскву. Сам жа Браўхіч звярнуўся па тэлефоне да фюрара з просьбай узмацніць групоўку ў Беларусі. Ашаломлены гэтай размовай, Гітлер вырашыў сам прыбыць на месца падзей. Агульная колькасць салдат групы армій «Цэнтр» — 1 мільён 455 тысяч 900 чалавек, ужо жнівень, а немцы ўсё працягваюць «таптацца» на тэрыторыі Беларусі. Трэба было разабрацца, чаму прапрацаваны да драбнюткіх дэталяў план «Барбароса», расліччаны на вокамгненную вайну, аказаўся на мяжы зрыву. І гэта нягледзячы на загараджальныя загады для нямецкіх салдат, ідэалагічную апрацоўку, мяркуючы па дакументах, масіраваную. Адзін толькі прыклад. У фондзе 500, вопіс 12462 ЦАМАРФ захавалася «Памятка нямецкаму салдату», якую раздавалі літаральна кожнаму. Яе змест не пакідае ніякіх ілюзій аб «добрых намерах» немцаў у гэтай вайне. Каб развеяць іх у тых, хто спрабуе сёння апраўдаць фашыстаў і іх зверствы (маўляў, «гэта быў адказ на дзеянні партызан» або «калі б сустрэлі акупантаў, як у суседніх краінах, і ахвяр было б менш»), прывядзём некаторыя вытрымкі. «Помні і выконвай: 1. Раніцай, днём, ноччу заўсёды думай пра фюрара, няхай іншыя думкі не трывожаць цябе. ... Ты павінен толькі дзейнічаць, нічога не баяцца. Няма нерваў, няма сэрца, літасці, ты зроблены з нямецкага жалеза. 2. ... Знішчы ў сабе літасць і спачуванне — забівай любога рускага, савецкага, не спыняйся, калі перад табой стары ці жанчына, дзяўчынка або хлопчык. 3. Ніводная сусветная сіла не вытрымае перад германскім напорам. Мы паставім на калені ўвесь свет. Ты будзеш вырашаць лёсы Англіі, Расіі, Амерыкі. Знішчай усё жывое, што супраціўляецца на тваім шляху. Заўтра перад табой на каленях будзе стаяць увесь свет». І ўся агітка ў гэткім жа духу...

## Нешта пайшло не так

Візіт Гітлера на тэрыторыю Беларусі аказаўся для яго зусім не марнай, азнаямленчай прагулкай, а вельмі драматычнай, як пасля і для яго войска. Гэта спачатку была нейкая параднасць. Сустракаў фюрара не проста генералітэт, фактычна эліта нямецкай арміі — кавалеры Рыцарскага крыжа Першай сусветнай вайны — генерал-фельдмаршал фон Бок і генерал-фельдмаршал фон Клюге, камандуючы 2-й танкавай групай генерал-палкоўнік Вільгельм Гудэрыян і 3-й танкавай групай генерал-палкоўнік Герман Гот... Пра гэта мы даведваемся з фотасправаздачы пра наведванне Гітлерам Барысава, якая таксама захоўваецца ў архіве Мінабароны РФ. Следам за Гітлерам прызямліўся самалёт японскага пасла Осіма. На нараду ён прыбыў па асабістым запрашэнні Гітлера. Германія была вельмі зацікаўлена ў адкрыцці Японіяй другога фронту. Ці быў выпадковы выбар месца сустрэчы? Падчас вайны 1812 года ў Старабарысаўскай сядзібе спыняўся Напалеон Банапарт са сваёй світай, тут распрацоўваўся план заваявання Расіі, адсюль адкрываўся шлях на Маскву. Магчыма, і гэты факт павінен быў падкрэсліць асаблівы статус сустрэчы. Усё сімвалічна, улічваючы любоў Гітлера да містыкі. Але сама нарада, мяркуючы па дакументах, і як і падзеі на фронце, пайшла не так.

Гітлер настойваў на тым, каб група армій «Цэнтр» перайшла да абароны, а танкавая армія Гудэрыяна павярнула з Маскоўскага напрамку на Гомель.

Са стэнаграмы выступлення Гітлера на нарадзе: «Першая дасягальная мэта — Ленінград і рускае ўзбярэжжа Балтыйскага мора, у сувязі з тым, што ў гэтым раёне маецца вялікая колькасць прамысловых прадпрыемстваў, а ў самім Ленінградзе знаходзіцца адзіны завод па вытворчасці звышцяжкіх танкаў, а таксама ў сувязі з неабходнасцю ліквідацыі рускага флоту на Балтыцы. Варта заняць Эстонію і рускія астравы на Балтыйскім моры...» Нямецкія генералы не хавалі здзіўлення. З успамінаў ад'ютанта фюрара: «...мы прыляцелі ў Барысаў, дзе размяшчалася камандаванне армейскай групы «Цэнтр». Гітлер вёў падрабязныя гутаркі з генераламі. Браўхіч, Бок і Гальдэр упарта настойвалі на тым, што ў армейскай групы «Цэнтр» ёсць толькі адна мэта — узяцце Масквы. Яны былі аптымістычна настроены і ў тым сэнсе, што гэтага можна дабіцца пасля некаторых перагрупровак і даўзбраення яшчэ да пачатку неспрыяльнай пары года».

Гітлер стаяў на сваім: трэба спыніцца за Смаленскам і сіламі армейскай групы «Поўдзень» узяць Растоў. Наступленне на Маскву трэба арганізаваць такім чынам, каб наступальныя кліны з гэтых двух пунктаў сышліся на ўсходзе ад Масквы. Са стэнаграмы выступлення Гітлера на нарадзе: «Раён Масквы па сваёй важнасці стаіць толькі на трэцім месцы. Таму аперацыя ў паўднёва-ўсходнім напрамку з'яўляецца першачарговай, у той час як на ўсходнім напрамку пакуль, відавочна, лепш выбраць абарончы спосаб дзеяння. У гэты горад не павінен уступіць ні адзін нямецкі салдат. Маскву варта акружыць так, каб з яе не выйшлі ні рускія салдаты, ні грамадзянскае насельніцтва. Будуць прыняты меры для таго, каб затапіць Маскву і яе наваколлі...»

Генералы з ім не згодныя, настойваюць на прасоўванні на Маскву, запэўніваючы фюрара, што сталіцу СССР захопяць лёгка. На нарадзе ў Старабарысаве Гітлер пераконвае японскага пасла Осіма адкрыць другі фронт, той агучвае пазіцыю краіны — Японія ўстрымаецца. Да адзінай думкі прыйсці не ўдавалася. У прыгарадзе Барысава робіцца першая і няўдалая спроба штабных афіцэраў арыштаваць Гітлера. Група ж армій «Цэнтр» працягнула наступленне на Маскву, сутыкнуўшыся з беспрэцэдэнтным супраціўленнем Чырвонай Арміі, у тым ліку і з боку 63-га стралковага корпуса. У пачатку жніўня Саўінфармбюро працягвала паведамляць: «63-і стралковы корпус пад камандаваннем Леаніда Рыгоравіча Пятроўскага з 13 ліпеня 1941 года ўтрымлівае беларускія гарады Рагачоў і Жлобін». Тое, што фашысты «завязлі» ў Беларусі, вялікая і яго роля. Каб зразумець, наколькі высокая была цана любой паспяховай аперацыі першых месяцаў вайны, цана Жлобінска-Рагачоўскай аперацыі, якую ўдалося ажыццявіць пад камандаваннем генерала Пятроўскага, варта звярнуцца да дакументаў, сведчанняў той пары.

## За Радзіму стаяць насмерць!

У пачатку ліпеня 1941 года Пятроўскаму паступіў загад камандуючага Заходняй Асобай ваеннай акругай генерала арміі Дзмітрыя Рыгоравіча Паўлава. (Фактычна адзін з апошніх, падпісаных ім перад яго арыштам 7 ліпеня 1941 года. Генерала абвінавацілі ў «баязлівасці, развале кіравання войскамі» і расстралялі разам з іншымі военачальнікамі ў Лефортава ўжо 22 ліпеня.) Тады ж часцям 63-га стралковага корпуса прадпісвалася заняць пазіцыі па лініі Гадзілавічы, Рагачоў, Жлобін, Стрэшын. Задача — замацавацца на ўсходнім беразе Дняпра, а ў выпадку спроб немцаў пераправіцца цераз яго — адкінуць праціўніка. «Гатоўнасць абароны 3 ліпеня 1941 года, 16.00», — гаварылася ў ім. Але, як паказалі падзеі, камандаванне корпуса крыху інакш распарадзілася сітуацыяй: распрацоўваўся план наступальнай аперацыі. Яшчэ ў пачатку чэрвеня 1941 года корпус дыслацыраваўся ў Прыволжскай ваеннай акрузе, камандаванне якой перад вайной прыняў Леанід Рыгоравіч Пятроўскі. У 1938 годзе ён трапіў у жорны перадваенных рэпрэсій у арміі, быў звольнены з яе па лжывых даносах, у 1940-м яго вярнулі на службу. Краіна мела патрэбу ў вопытных ваенных кадрах. У сувязі з трывожнай сітуацыяй каля заходніх граніц СССР пачалася тэрміновая перакідка корпуса ў Беларусію для папаўнення войскаў Заходняй Асобай ваеннай акругі. Быў улічаны і вопыт службы Пятроўскага — тут у пачатку 1920-х ён ваяваў з белапалякамі, камандаваў батальёнам, зімой 1925 года прыняў полк у 29-й дывізіі, а ў 1937-м узначаліў 5-ы стралковы корпус, які не раз праводзіў вучэнні ў раёне Рагачова, Жлобіна, адпрацоўваючы наступленне на Бабруйск. Цяпер трэба было выканаць усё ў рэальнай абстаноўцы.



Гітлер у Барысаве, 04.08.1941 г.

# ГЕНЕРАЛА ПЯТРОЎСКАГА, кашмар Гітлера

Вайна заспела корпус у дарозе, толькі першыя яго эшалоны паспелі прыбыць 21 чэрвеня на станцыі Добруш і Нова-Беліца. Раніцай 22 чэрвеня фашысты ўжо бамбілі Гомель, масты цераз Сож. Шэраг часцей корпуса разгортвалі і накіроўвалі на поўнач, у раён Оршы. Астатнія ўвайшлі ў склад 21-й арміі. Пра тое, што адбывалася ў гэтыя дні ў корпусе, даведваемся з некалькіх лістоў Пятроўскага родным. У Маскве заставаліся дачка Оля і жонка Надзея Вікулава. (Дарэчы, сваё каханне Леанід Рыгоравіч сустрэў таксама ў Беларусі, у 1923 годзе, у Віцебску.) З ліста ад 24 чэрвеня. «...Спраў было шмат, сёння спаў усяго тры гадзіны. Ці буду ноччу спаць — не ведаю... Вельмі шкадую, што я не сярод першых часцей, а пакуль у тыле. Мы ўсе ўпэўнены ў перамозе і кожны з нас гарыць жаданнем змагацца за Радзіму, за вас, нашых блізкіх, якіх мы абараняем...» І за Радзіму стаялі насмерць.


Центральный Комитет КП(б)Белоруссии

Особый сектор

Спецсообщения, докладные и справки органов НКВД и НКГБ

Начато ... июня 1941 г.
Окончено ... июня 1941 г.
На 202 листах

Імклівае наступленне корпуса пачалося на світанні 13 ліпеня з усходняга берага Дняпра. Немцы, якія ўжо гаспадарылі ў Рагачове, Жлобіне, не маглі і падумаць, што дэмаралізаваная з іх пункту гледжання савецкая армія рашыцца на нейкія дзеянні. Гэта стала для іх поўнай нечаканасцю. Як ажыццяўлялася аперацыя — у дакументах рассакрэчанага архіва Маршала Савецкага Саюза Радзівона Маліноўскага, які захоўваецца ў ЦАМАРФ. Яна пачалася глыбокай ноччу, калі перадавыя палкі 63-га стралковага корпуса, застаючыся незаўважанымі, у раёне Жлобіна змаглі адназіць узарваны пралёт моста цераз Дняпро і пасля масіраванай артпадрыхтоўкі разам з часцямі корпуса пачаць яго фарсіраванне.

З данясення 154-й стралковай дывізіі 63-га стралковага корпуса. «Да зыходу 13.07 дывізія двума палкамі вяла цяжкія баі, выкалупліваючы штыком і гранатай, расстрэльваючы ва ўпор засеўшых у бліндажах і дамах немцаў». Толькі 437-ы стралковы полк пад камандаваннем капітана Фёдара Баталава шэсць разоў падымаўся ў атаку, дзве з якіх былі штыкавыя. Немцы вымушаны былі адступіць.

З дзённіка камандуючага групай армій «Цэнтр» генерал-фельдмаршала фон Бока, 13 ліпеня 1941 года: «Раніцай мяне дастаткова здзівіў рапарт пра тое, што танкавая група Гудэрыяна пакінула плацдарм на беразе Дняпра ў раёне Рагачова. Добраахвотна гэта было зроблена ці пад ціскам праціўніка, пакуль не ясна».

З ліста генерала Пятроўскага родным у Маскву ад 14 ліпеня: «У нас сёння поўны выхадны, вораг сядзіць ціха пасля таго, як мы набілі яму морду».

Запіс у дзённіку камандуючага групай армій «Цэнтр» генерал-фельдмаршала фон Бока, 15 ліпеня. Ён праясняе сітуацыю: «Рускія робяцца нахабнымі на паўднёвым крыле 2-й арміі. Яны атакуюць каля Рагачова і Жлобіна».

## Паляванне на Пятроўскага і загадкавая гібель

Наступленне аказалася такім імклівым і нечаканым, што немцы пачалі аказваць супраціўленне толькі пасля таго, як батальёны выйшлі ўжо да ўскраін Жлобіна і Рагачова. Два беларускія гарады сталі першымі ў гісторыі вайны, вызваленымі ад фашыстаў. І вызвалены яны былі 63-м стралковым корпусам пад камандаваннем Леаніда Рыгоравіча Пятроўскага. Пачалося прасоўванне далей, на Бабруйск. Немцы змаглі іх спыніць толькі на 30-м кіламетры. Але тым не менш 50-кіламетровая тэрыторыя аказалася вызваленая ад фашыстаў. А вышэйшае нямецкае камандаванне, не хаваючы раздражнення, сур'ёзна загаварыла пра 63-і стралковы корпус як пра моцнага саперніка. З «Ваеннага дзённіка» начальніка Генеральнага штаба Сухапутных войскаў Гальдэра 15 ліпеня: «Рускія войскі змагаюцца з найвялікшай разлютаванасцю»... Немцы вымушаны былі не толькі адступіць, але і перагрупаваць свае сілы, адцягнуць іх вялікую колькасць ад напрамку галоўнага ўдару. Корпус пад камандаваннем Пятроўскага зрываў планы нямецкага камандавання. Камандзіру 437-га стралковага палка Фёдару Баталаву ў ліку першых у СССР 9 жніўня 1941 года было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. З апошняга ліста Пятроўскага. «Захапілі палонных, яны кажуць, што шмат іх пабілі. Праўда, і нам нялёгка. Сяджу ў штабной машыне, а наша артылерыя б'е залпамі па немцах. Сёння быў на фронце двойчы. Майго аднаго ахоўніка параніла, мне ж шанцуе, хоць я ўжо двойчы хадзіў у атаку. Дакладней, падымаў людзей у атаку. На вайне, вядома, заўсёды шмат цяжкасцяў і стамляешся жудасна. Спаць амаль не даводзіцца».

**У фондзе 500, вопіс 12462 ЦАМАРФ захавалася «Памятка нямецкаму салдату», якую раздавалі літаральна кожнаму. Яе змест не пакідае ніякіх ілюзій аб «добрых намерах» немцаў у гэтай вайне.**

30 дзён і начэй корпус трымаў абарону, перакрываючы шляхі наступлення на Гомельскім напрамку. Баючыся флангавага ўдару, нямецкаму камандаванню супраць трох савецкіх дывізій прыйшлося зняць з напрамку галоўнага ўдару сем злучэнняў. Прычым штаб аднаго з іх часці 63-га корпуса пры прарыве да сваіх разнеслі ў пух і прах, захапіўшы пры гэтым сакрэтную дакументацыю. Больш за тыдзень танкавы клін Гудэрыяна, адкінуты ад Дняпра, быў вымушаны шукаць новую пераправу. Але, нягледзячы на поспехі корпуса, Чырвоная Армія адыходзіла. Корпус быў адрэзаны ад асноўных сіл, кола вакол яго сціскалася. Познім вечарам 13 жніўня ў штабе 63-га корпуса прынялі тэрміновую шыфраграму. Гэта быў загад за подпісам камандуючага і члена Ваеннага савета фронту. Пятроўскаму прадпісвалася «неадкладна ўступіць у камандаванне 21-й арміяй». За бліскуча праведзеную аперацыю яму прысвоена воінскае званне генерал-лейтэнанта. Неўзабаве ў размяшчэнне корпуса прыбыў і самалёт за Пятроўскім. Але Леанід Рыгоравіч не палічыў магчымым у такі цяжкі час пакінуць корпус. У камандавання фронтам ён просіць адтэрмінаваць выкананне загаду, на прысланым самалёце адпраўляе ў тыл цяжка параненых байцоў. Сам жа пачынае рыхтаваць прарыў акружэння і адначасова наступленне. Але падзеі пачалі развівацца так імкліва, што спатрэбілася поўная перагрупоўка сіл. На досвітку працўнік перайшоў у наступленне, прарваў абарону 154-й стралковай дывізіі, разбурыў пераправы цераз Дняпро ў раёне Жлобіна, да якога ўсё падыходзілі і падыходзілі новыя нямецкія часці. Іх задача — акружыць 63-і стралковы корпус і адкрыць дарогу на Гомель. У самога ж корпуса сувязь аказалася перарваная. Пятроўскаму давялося кіраваць баявымі дзеяннямі, не маючы ніякіх звестак аб становішчы на суседніх участках фронту. У ноч на 15 жніўня яны пачалі адыходзіць на рубеж Стоўпня, Гарадзец, Жлобін з тым, каб, прыкрываючыся з тылу часцямі 61-й стралковай дывізіі, нанесці сіламі 154-й стралковай дывізіі ўдар па ворагу ў напрамку горада Стрэшын і адкінуць яго за Дняпро. Манеўр атрымаўся. Імклівы ўдар прымусіў гітлераўцаў адступіць. Усё гэта раздражняла нямецкае кіраўніцтва, такога нахабства яны не чакалі, як і таго, што корпус стаяў насмерць. Немцы ахрысцілі яго «Чорным корпусам» — дні бітваў на гомельскім напрамку для іх сталі сапраўды чорнымі. На Пятроўскага пачалося паляванне. Ён жа 16 жніўня ў 12 гадзін аддаў загад на прарыў, дзе рукой дапісаў: «Усяму начсаставу, незалежна ад звання і пасады, у перыяд начной атакі, аж да злучэння часцей корпуса з часцямі Чырвонай Арміі знаходзіцца ў перадавых ланцугах, маючы пры сабе эфектыўную зброю з задачай аб'яднаць вакол сябе ўвесь асабовы склад дывізіі...» У раёне Чацвярні (15 км на паўднёвы ўсход ад Жлобіна) Пятроўскі ўдакладніў задачы дывізіям і паказаў, што ён разам з групай камандзіраў штаба корпуса будзе рухацца сумесна з 154-й стралковай дывізіяй. Атака назначалася на 3 гадзіны 17 жніўня 1941 года. Усё прадумана да дробязяў, да прарыву нямецкага акружэння ўсё гатова, але далей звесткі абрываюцца... і — загадкавая гібель генерала. Апошняе, што памятаюць відавочцы, — генерал-лейтэнант Пятроўскі з групай афіцэраў штаба пасля кароткай, але магутнай артпадрыхтоўкі ўзначаліў атаку падраздзяленняў, каб прарваць акружэнне. А далей — домыслы, чуткі, здагадкі...

## Заслона сакрэтнасці

Доўгія гады зразумець, што ж здарылася ў трагічныя дні сярэдзіны жніўня, было складана — доступ да дакументаў быў абмежаваны, як высветлілася, па важкіх на той перыяд прычынах. У 1944 годзе, пасля вызвалення рэспублікі ад фашыстаў і распачатага расследавання, атрымалася знайсці магілу камкора, на ёй крыж і надпіс... на нямецкай мове «Генерал-лейтэнант Пятроўскі». І прыпіска: «Камандзіру «Чорнага корпуса». Мясцовыя жыхары распавялі, што пасля гібелі савецкага генерала немцы пахавалі яго з усімі воінскімі ўшанаваннямі. Менавіта гэты факт адыграў фатальную ролю ў ацэнцы дзейнасці 63-га стралковага корпуса і асабіста яго камандзіра. Аж да мая 1965-га — матэрыял пад грыфам рознай ступені сакрэтнасці, 25 гадоў забіццё ўнікальнай ваеннай аперацыі, табу і на асобу самога Пятроўскага. І гэта нягледзячы на тое, што 6 чэрвеня 1944 года была праведзена эксгумацыя генерал-лейтэнанта з наступнай канстатацыяй: «...На чэрапе і ў вобласці цемянной і левай скроневай косці парушэнні цэльнасці чарапнога века зоркападобнай формы, памерам 10 на 18 сантыметраў...». Відавочны факт — Пятроўскі пусціў сабе кулю ў лоб, хутчэй за ўсё, апошнюю. Але пры якіх абставінах? Дзе знаходзіліся людзі з блізкага акружэння, якія суправаджалі генерала? Доўгія гады — заслона сакрэтнасці. Версіі розныя, у тым ліку і тое, што гібель звязана са здрадай асоб з найбліжэйшага акружэння генерала, з укаранёнай яшчэ ў перадваенны перыяд у кіраўніцтва Заходняй Асобай ваеннай акругі агентурай, падрыхтаванай у нетрах Абвера. Увага да злучэнняў, якія базіруюцца ў Беларусі, была асаблівая. Толькі перад вайной выяўлена больш за 100 арганізаваных груп, закінутых на тэрыторыю рэспублікі. На жаль, былі і такія, хто падазраваў самога генерала, які з нейкіх прычын апынуўся ў лесе, на машыне, без аховы. Спецыяльна адарваўся ад сваіх ці так атрымалася? Час быў складаны. Гучныя пасляваенныя працэсы ў дачыненні да ваенных захліснулі краіну — трафейная справа і авіяцыйная, справа артылерыстаў.... Тысячы класных военачальнікаў, прайшоўшы кровапралітную вайну, зноў траплялі ў жорны рэпрэсій. Праз гады на абарону сумленнага імя генерала Пятроўскага ўстала эліта савецкай арміі, маршалы СССР Дзмітрый Язаў, Андрэй Яроменка. Георгій Жукаў у сваім звароце да кіраўніцтва краіны пісаў: «Леаніда Рыгоравіча Пятроўскага я добра ведаў як аднаго з самых таленавітых і адукаваных военачальнікаў, і калі б не заўчасная гібель, думаю, што ён стаў бы камандзірам буйнога маштабу». Рашэннем Палітбюро ЦК КПСС і ўрада СССР у 1964 годзе генерал-лейтэнант Пятроўскі быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

**Агульная колькасць салдат групы армій «Цэнтр» — 1 мільён 455 тысяч 900 чалавек, ужо жнівень, а немцы ўсё працягваюць «таптацца» на тэрыторыі Беларусі.**

Наступленне ж на Маскву, супраць якога пярэчыў Гітлер, як вядома, для групы армій «Цэнтр» скончылася трагічна — паражэннем, ад якога немцы так і не змаглі акрыяць. І гэта нягледзячы на велізарныя ваенныя рэсурсы — 75 дывізій, якія налічвалі 1,8 мільёна чалавек, звыш 14 тысяч гармат, 1700 танкаў і 1390 самалётаў, і нават на загараджальныя загады. Страты толькі групы армій «Цэнтр» падчас наступлення на Маскву з кастрычніка да пачатку снежня 41-га склалі звыш 145 тысяч чалавек, падчас ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі — 229 тысяч забітых, параненых і зніклых без вестак. Амаль уся эліта нямецкай арміі — удзельнікі нарады ў Старабарысаве, была адпраўлена ў адстаўку пасля паражэння пад Масквой, у тым ліку і яе камандуючы генерал-фельдмаршал Фон Бок, які яшчэ ў чэрвені 1941 года са здзіўленнем заўважыў: «Тут і там рускія афіцэры страляюцца, каб пазбегнуць палону». Нямецкаму генералу, якога Гітлер абвінавціў у правале аперацыі «Тайфун» па ўзяцці Масквы, складана было зразумець, што такое для савецкага чалавека абараняць Радзіму. Сам жа ён знік пасля ганебнай кампаніі з тэатра ваенных дзеянняў з фармулёўкай «па стане здароўя»...

**Наталля ГОЛУБЕВА,**
**кандыдат гістарычных навук.**





Дакументы аб падаўленым настроі нямецкіх салдат у першыя месяцы ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь).

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Март на Драйве! Мастеркард»

**1. Организатор Рекламной игры**

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор), с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

**2. Наименование и территория проведения Рекламной игры**

Рекламная игра имеет наименование «Март на Драйве! Мастеркард» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

**3. Срок начала и окончания Игры**

Игра проводится с 01 марта 2021 г. по 15 мая 2021 г. (включая срок выдачи выигрыша и опубликования результатов проведения Игры).

**4. Комиссия по проведению Игры**

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

Даниленко Валерий Михайлович – Управляющий ООО «Рефорте», председатель комиссии;

Швед Екатерина Александровна – специалист по работе с клиентами ООО «Рефорте»;

Кузнецов Дмитрий Владимирович – индивидуальный предприниматель;

Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «Рефорте Групп»;

Чефанова Маргарита Игоревна – бухгалтер ООО «Рефорте».

**5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard, эмитированных банками Республики Беларусь (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, для оплаты за покупку топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

**6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Игры**

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства.

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

- в период с 01 марта 2021 г. по 31 марта 2021 г. включительно совершить не менее трех покупок топлива отдельными чеками в различные даты по Карте Mastercard, эмитированной банками Республики Беларусь, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля в каждом чеке с использованием зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты Участника Игры (в дальнейшем – Карта «Заправка»), которая определяет физическое лицо как участника программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Заправка» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества (при наличии), даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенного пункта, а также адреса электронной почты.

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

**7. Состав и размер призового фонда, источники его формирования**

